Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 ЛЮТАГА 2016 г. ПЯТНІЦА № 32 (28142) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



З Мінска ў Гомель. На новым «Штадлеры»

СТАР. 4



Хто вучыць мове з тэлеэкранаў?

СТАР. 5



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей МІХНЕВІЧ, старшыня праўлення Беларускай аўтамабільнай асацыяцыі:**

*«У 2015 годзе ўвоз у краіну новых аўтамабіляў перавысіў увоз патрыманых. З 50 тысяч зарэгістраваных летась у краіне аўто прыкладна 46 тысяч — новыя. Беларусь нават упершыню ўвайшла ў топ-25 Еўропы. Дзякуючы гэтай тэндэнцыі, аўтамабільны рынак краіны становіцца легальным і прадказальным у большай ступені, а значыць, больш бяспечным для пакупнікоў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.02.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 21616,00 | ▼ |
| Еўра | 24085,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 286,26 | ▲ |
| Укр. грыўня | 812,63 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Як не бондар — дык лыжачнік



Фота Анатоля КЛЯШЧУКА.

Жыхар вёскі Грыгараўшчына Шаркаўшчынскага раёна Валянцін Піцько да так званай «перабудовы» працаваў фатографам у службе быту раёна. Калі не стала заказаў, вярнуўся ў вёску і заняўся дзедавым, а насамрэч традыцыйным рамяством — бондарствам, рабіў тапарышчы, граблі, касавільны. Зладзіў невялікую майстэрню, набыў адпаведныя інструменты і пачаў шчыраваць з кадушкамі і маслабойкамі, а яшчэ і з... лыжкамі. Зімою, калі ў полі, на агародзе і з пчоламі — адпачынак, Валянцін Піцько рыхтуе адмысловыя загатоўкі з ліпы, клёну, вольхі і асіны, а потым ператварае іх у патрэбны хатні рыштунак. Сваю драўляную прадукцыю ён адвозіць на мясцовы кірмаш. У раёне майстра з Грыгараўшчыны ведае кожная гаспадыня.

■ Ракурс

## СТАРЫЯ ЗАГАНЫ НОВЫХ ДАМОЎ

### Асобныя гаспадары сацыяльных кватэр становяцца праблемай для навакольных і камунальнікаў

**І на шматлікіх нарадах работнікаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, і на сходах праваахоўнікаў апошнім часам даводзіцца чуць аб праблемах сацыяльных дамоў. Правільней сказаць, аб праблемах, што ствараюць асобныя іх жыхары. Больш за ўсё непакояць спецыялістаў санітарны стан пад'ездаў, наўмыснае псаванне агульнай маёмасці, абыякавыя адносіны да месца, дзе чалавек жыве. У іншы пад'езд літаральна зайсці непрыемна. Але пра гэта — крыху пазней.**

### Гісторыя Ірыны Кушнярук

Гісторыя гэтай жанчыны ў многім павучальная. Ірына — гаспадыня кватэры ў доме па вуліцы Гвардзейскай брэсцкага мікрараёна Паўднёвы. Атрымала сваю сацыяльную аднапакаёўку як сірата чатыры гады таму. Да гэтага дзяўчына выхоўвалася ў інтэрнатных установах вобласці. Пасля скончыла ліцэй лёгкай прамысловасці, атрымала спецыяльнасць швачкі. На працу па размеркаванні маладая работніца трапіла на брэсцкую фабрыку «Дынама». Аформіла неабходныя дакументы, і ў хуткім часе яе паклікалі па ключы ад уласнага жылля.

У кватэры Ірыны мала сказаць, што чыста і ўтульна, — у ёй прыгожа. І кухня, і прыхожая аздоблены разнастайнымі вырабамі гаспадыні. Яна робіць мудрагелістыя пано з кветак і розных сухіх раслін, кампазіцыі ў стылі мадэрн з кававых зярнят, гузікаў, гарбузных семак.

СТАР. 3



Хто ў адказе за сацыяльны дом?

■ Надвор'е

## Мокры снег з дажджом і парывісты вецер

**Сёння ўдзень тэрыторыя Беларусі трапіць пад уплыў атмасферных франтоў, аднак па ўсходзе краіны яшчэ будзе гаспадарыць вобласць павышанага атмасфернага ціску. Таму чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, а пераважна па заходняй палове краіны пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.**

Месцамі прагназуецца галалёд, а на асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра будзе ад мінус 1 да плюс 4 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 5-6 цяпла. Няўстойлівае надвор'е чакаецца ў нас і на выхадныя. У гэтыя дні на тэрыторыю краіны завітаюць атмасферныя франты, якія змяшчаюцца з паўднёвага захаду Еўропы. Ужо ў суботу ў заходніх і цэнтральных раёнах краіны пройдуць ападкі ў асноўным у выглядзе мокрага снегу. Месцамі магчымы слабы галалёд, на дарогах захаваецца галалёдзіца. Вецер будзе паўднёва-ўсходні парывісты. Чакаецца, што тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла, а ўдзень будзе ад мінус 2 да плюс 5 градусаў.

СТАР. 3

# ТРЭБА ВЫЙГРАВАЦЬ!

**Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у цырымоніі адкрыцця Палаца спорту «Уручча» і міжнароднага дзіцячага турніру па гандболе.**

Выступаючы на ўрачыстай цырымоніі, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што новы Палац спорту «Уручча» шматпрофільны, але ўсё ж асноўная ўвага тут будзе ўдзелена гандболу і яго папулярызацыі. «Але хопіць гаварыць аб папулярызацыі. Трэба выйграваць, — запатрабаваў Прэзідэнт. — Мы шмат укладваем у спорт, але аддачы належнай пакуль не атрымалі».

«Нам патрэбны вынік. І трэба даваць вынікі ў спорце вышэйшых дасягненняў», — падкрэсліў Прэзідэнт. На яго думку, для гэтага ёсць усе неабходныя ўмовы.

Новы Палац гульнявых відаў спорту Узброеных Сіл Беларусі прымае сваіх першых наведвальнікаў. «Гэты аб'ект унікальны па сваім профілі. Аналагічных яму ў нас яшчэ не было, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — У залах створаны ўсе неабходныя ўмовы для правядзення міжнародных спаборніцтваў і падрыхтоўкі спартсменаў самага высокага ўзроўню». Тут будуць трэніравацца гульцы па такіх відах спорту, як гандбол, валейбол, баскетбол і міні-футбол, а таксама тэніс і бадмінтон. Сюды змогуць прыйсці не толькі ваеннаслужачыя, але і жыхары, госці сталіцы.

У краіне імкнуцца не толькі выхоўваць маладых атлетаў, але і ўмацоўваць здароўе моладзі. Менавіта таму нараўне са спаборніцтвамі прафесійных спартсменаў сёння праводзяцца дзіцячыя спаборніцтвы. Аляксандр Лукашэнка асабліва адзначыў вялікую ролю спорту ва ўмацаванні даверу і дружбы паміж народамі, што, несумненна, служыць захаванню



міру. «Прыемна бачыць тут нашых суседзяў, замежных гасцей. Усім зразумела, што краіны павінны сапернічаць выключна на спартыўных арэнах, але ні ў якім разе не на полі бою», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Кіраўніка дзяржавы праінфармавалі аб выкананні яго даручэнняў па рэканструкцыі і ўводу ў эксплуатацыю Палаца спорту «Уручча» дзяржаўнай установы «Спартыўны камітэт Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», паведамляе БЕЛТА. Гэты ўніверсальны спартыўны комплекс прызначаны для падрыхтоўкі нацыянальных зборных каманд, спартыўных клубаў, спецыялізаваных спартыўных класаў Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча па многіх відах спорту. У ходзе будаўніцтва максімальна выкарыстоўваліся беларускія будаўнічыя матэрыялы, а таксама частка абсталявання.

Прэзідэнт закрануў тэму стварэння айчынных спартыўных трэнажораў. Ён пераканаены, што іх неабходна выпрабляць. «Трэба абавязкова гэта зрабіць. І не варта баяцца прыступаць да дадзенай вытворчасці», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка асобна закрануў тэму развіцця гандбола. На яго думку, цяпер гэты від спорту знаходзіцца ў памежным стане. Яго прыўзнялі на нейкі ўзровень, але неабходны штуршок для належнага развіцця. Прэзідэнт не сумняецца, што беларускія гандбалісты здолеюць дасягнуць высокіх вынікаў.

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з функцыянальнымі магчымасцямі новага спартыўнага аб'екта, папрысутнічаў на трэніроўцы гандбольнага клуба «СКА-Мінск». Ён цёпла пагутарыў з гандбалістамі і сфатаграфаваўся з імі.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка папрысутнічаў на трэніроўцы нацыянальнай зборнай па бадмінтоне.

### ТЭЛЕФОННАЯ РАЗМОВА З ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРАМ ПАКІСТАНА

**Па ініцыятыве пакістанскага боку сёння адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з прэм'ер-міністрам Пакістана Навазам Шарыфам, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

У час размовы былі дэталёва абмеркаваны бягучая сітуацыя і перспектывы развіцця двухбаковых адносін, а таксама міжнародны парадак дня.

Адным з вынікаў размовы стала дамоўленасць аб тым, што ў бягучым годзе Аляксандр Лукашэнка наведае Пакістан з афіцыйным візітам. У час размовы бакі выказалі ўпэўненасць, што маючы адбыцца візіт надасць новы імпульс двухбаковым адносінам і дасць магчымасць дабіцца прарыву ў супрацоўніцтве, а таксама ўстанавіць больш цесныя палітычныя і гандлёва-эканамічныя сувязі. Канкрэтныя тэрміны візіту будуць узгоднены пазней па дыпламатычных каналах.

У цэлым Прэзідэнт Беларусі і прэм'ер-міністр Пакістана выказалі ўпэўненасць у тым, што краіны чакае цеснае, напоўненае канкрэтыкай супрацоўніцтва ў эканоміцы, палітыцы, сацыяльнай і гуманітарнай сферах.

■ Знешняя палітыка

## ДЭЛЕГАЦЫЯ ЕЎРАСАЮЗА НАВЕДАЕ НАШУ КРАІНУ

**Як паведаміў на чарговым брыфінгу начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Дзмітрый МІРОНЧЫК, візіт запланаваны на 24 лютага. У нашу краіну прыбудуць прадстаўнікі Еўрапейскай камісіі і Еўрапейскага інвестыцыйнага банка.**

Дэлегацыю ўзначаляць намеснік Генеральнага дырэктара Еўрапейскай камісіі па пытаннях суседства і перамоў аб пашырэнні Катарына Матэрнава і віцэ-прэзідэнт Еўрапейскага інвестыцыйнага банка (ЕІБ) Ласла Бараняй. У склад дэлегацыі таксама ўвойдуць прадстаўнікі Генеральнага дырэктарата Еўрапейскай камісіі па эканамічных і фінансавых пытаннях, Пастаяннага прадстаўніцтва ЕІБ у Маскве і Прадстаўніцтва ЕС у Беларусі.

Як паведамляецца, падчас візіту прадугледжаны сустрэчы прадстаўнікоў Еўрасаюза з кіраўніцтвам Нацыянальнага банка, Міністэрства эканомікі, Міністэрства фінансаў, МЗС, а таксама ў Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. «У рамках сустрэч плануецца разгледзець стан і перспектывы развіцця эканамічнага і фінансавага супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Еўрапейскім саюзам, а таксама магчымасці пашырэння ўзаемадзеяння Беларусі з еўрапейскімі і міжнароднымі фінансавымі інстытутамі», — расказаў Дзмітрый Міročнчык.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Дыялог бізнесаў

## АЙЧЫННЫЯ ПРАДУКТЫ АЦЭНЯЦЬ У ТОКІА

**Беларускія прадпрыемствы ўпершыню плануюць прыняць удзел у 41-й міжнароднай выставе прадуктаў харчавання і напояў «Фудэкс Джапан». Нацыянальная экспазіцыя беларускіх тавараў будзе дэманстравацца ў Токіа з 8 па 11 сакавіка.**

У гандлёва-прамысловай палаце Беларусі лічаць, што будучая падзея — унікальная магчымасць для наладжвання новых дзелавых кантактаў і выхаду айчынных прадпрыемстваў на рынак Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна. Японская выстава дае магчымасць беларускім экспарцёрам прадставіць такую прадукцыю, як мяса, малако, кандытарскія, хлебабулачныя і макаронныя вырабы, гародніну, садавіну, цукар, сіроп, мёд, алей, алкагольныя і безалкагольныя напоі. У гандлёва-прамысловай палаце лічаць, што адной з асноўных канкурэнтных пераваг беларускіх прадуктаў сярод іншых з'яўляецца адсутнасць ГМА. Гэта павінна выклікаць да іх высокую цікавасць.

«Фудэкс Джапан» — выстава прадуктаў харчавання і напояў №1 у Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне. Каля дзвюх трацін удзельнікаў выставы — міжнародныя кампаніі, якія выкарыстоўваюць гэтую пляцоўку як магчымасць наўпрост сустрэцца з пакупнікамі з Японіі. У 2015 годзе яна стала рэкорднай за ўсю сваю гісторыю, сабраўшы амаль 3 тысячы ўдзельнікаў, а гэта кампаніі з 79 краін свету. За 4 дні выставу наведалі больш за 77 тысяч чалавек.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Меркаванне

## МІЖНАРОДНАЯ (НЕ)БЯСПЕКА І «МІНСКІ ДЫЯЛОГ»



**На мінулых тыднях у цэнтры ўвагі міжнароднай супольнасці зноў былі пытанні бяспекі. Гэта звязана і з нарастаючымі супярэчнасцямі на Блізкім Усходзе, міграцыйнымі пытаннямі і з шэрагам важных дат і падзей. У прыватнасці, з першай гадавінай Мінскіх пагадненняў па ўкраінскім крызісе, а таксама з чарговай Мюнхенскай канферэнцыяй па бяспецы.**

Усе гэтыя падзеі адлюстроўваюць такі ўзровень міжнародных выклікаў, які яшчэ некалькі гадоў таму цяжка было ўявіць. У дыскусіях падчас Мюнхенскай канферэнцыі шмат разоў гучалі такія характарыстыкі сучаснасці, як «новая халодная вайна» і «самы небяспечны перыяд пасля падзення Берлінскай сцяны». І казалі пра гэта амаль усе: палітыкі, дыпламаты і даследчыкі.

За апошнія дзесяцігоддзі мы неяк прызвычаіліся да дыскусій пра выклікі з боку недзяржаўных суб'ектаў міжнародных адносін, гэта значыць арганізацый ці асоб, якія не маюць прамога дачынення да ўрадаў і дзейнічаюць па-за межамі міжнароднага права. Гэта, перш за ўсё, рознага кшталту тэрарыстычныя арганізацыі. Пагрозы з іх боку сёння як ніколі высокія, дастаткова згадаць апошнія трагедыі ў Парыжы і тэракт над борце расійскага авіялайнера ў небе над Егіптам. У шок прыводзіць і дзейнасць так званай «Ісламскай дзяржавы».

Але ж сёння і міждзяржаўныя адносіны шмат у якіх пунктах планеты як ніколі напружаныя. Для Беларусі, зразумела, асабліва адчувальныя глыбінныя супярэчнасці паміж Расіяй і краінамі Захаду. Менавіта ў іх кантэксце прэм'ер-міністр Расіі Дзмітрый Мядзведзеў і казаў у Мюнхене пра новую «халодную вайну».

Для беларускага грамадства і дзяржавы, як і для любой іншай суверэннай краіны, такая напружаная міжнародная сітуацыя з'яўляецца велізарным выклікам для ўласнага дабрабыту і незалежнасці. Каб мінімізаваць гэты выклік, патрэбныя добра прадуманыя і нават нестандартныя захады. І адным з іх, як вядома, стала стварэнне мінскай перамоўнай пляцоўкі па ўкраінскім крызісе.

Нагадаю: у жніўні 2014 года ў беларускай сталіцы прайшла сустрэча ў фармаце ЕС — Украіна — Еўразійскі эканамічны саюз, таксама ў Мінску пачала рэгулярна збірацца Трохбаковая кантактная група АБСЕ. Нарэшце, 11-12 лютага 2015 года мы прымалі саміт у Нармандскім фармаце (Украіна — Расія — Германія — Францыя), які пасля амаль 17 гадзін няспынных перамоў скончыўся падпісаннем Комплексу мер па выкананні Мінскіх пагадненняў. Больш шырока гэтыя дамоўленасці вядомыя як Мінск-2.

Праз год Беларусь зноў прымала прадстаўнікоў Нармандскай чацвёркі, але ўжо на экспертным узроўні. У рамках экспертнай ініцыятывы «Мінскі дыялог» прайшла міжнародная канферэнцыя, якая падвяла вынікі першага года Мінска-2 і прааналізавала перспектывы сітуацыі ва Украіне і ва ўсім еўрапейска-еўразійскім рэгіёне. Выступалі на канферэнцыі і афіцыйныя асобы. У прыватнасці, міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей і спецыяльны прадстаўнік дзеючага старшыні АБСЕ ва Украіне і Трохбаковай кантактнай групе Марцін Сайдзік. Але ж асноўнымі ўдзельнікамі дыскусій былі менавіта аналітыкі і даследчыкі.

Сама ініцыятыва «Мінскага дыялогу» паўстала на пачатку мінулага года як спроба экспертнай супольнасці зрабіць свой канструктыўны ўнёсак у справу вырашэння ўкраінскага крызісу і прадухіленне разрастанне геапалітычнага канфлікту паміж Расіяй і Захадам. Гэта так званы «другі трэк» дыпламатыі. Іншымі словамі, дыпламатыя на экспертным, недзяржаўным узроўні. Прадстаўнікі міністэрстваў замежных спраў і пасольстваў (гэта значыць дыпламаты «першага трэку») таксама прымаюць удзел у сесіях канферэнцый у якасці назіральнікаў з магчымасцю выказвацца па ўсіх пытаннях. Але ж галоўную ролю выконваюць менавіта вучоныя з даследчых інстытутаў і эксперты з недзяржаўных аналітычных цэнтраў.

Такі фармат у гісторыі даволі добра паказаў сябе як механізм налажвання каналаў камунікацыі, усталявання даверу і прадухілення міжнародных крызісаў. Там, дзе дзяржаўныя дыпламаты абмежаваныя афіцыйнай пазіцыяй сваіх краін, недзяржаўныя эксперты маюць больш дыскусійнай прасторы для пошуку новых ідэй і кампрамісаў. Пры адпаведным падыходзе потым гэтыя кампрамісы могуць станавіцца часткай афіцыйных перамоў і спрыяць вырашэнню складаных міжнародных канфліктаў.

На фоне ўкраінскага крызісу і агульнай эскалацыі геапалітычнага напружання на еўрапейскім кантыненце такога фармату сёння якраз і бракуе. І менавіта Беларусь, дзякуючы сваёй ролі перамоўнай пляцоўкі па вырашэнні ўкраінскага крызісу і актыўнаму нейтральнаму пазіцыянаванню, з'яўляецца аптымальным месцам для рэгулярнага экспертнага дыялогу.

Канферэнцыя ў гадавіну Мінска-2 стала ўжо трэцяй важнай падзеяй у рабоце «Мінскага дыялогу». У сакавіку 2015 года адбылася першая канферэнцыя пад назвай «ЕС, Расія і краіны Усходняй Еўропы: як пераадолець рознагалоссі?». А ў лістападзе эксперты разглядалі ўжо канкрэтныя "замарожаныя канфлікты" на постсавецкай прасторы і шукалі шляхі іх паступовага вырашэння.

Дыскусіі, як і на афіцыйным узроўні, ідуць дастаткова складана, бо ўзровень супярэчнасцяў заводзіць шматлікія пытанні ў тупік. Але ж жорсткія дэбаты заўсёды лепей кровапраліцця на фронце. Як кажуць, калі ідуць перамовы, то гарматы маўчаць. І леташнія Мінскія пагадненні гэта яскрава паказваюць.

Пры ўсіх праблемах рэалізацыі Мінска-2 (а там бакамі фактычна выкананы толькі адзін пункт з трынаццаці) удалося пазбегнуць тысяч патэнцыйных чалавечых ахвяр. Так, па звестках ААН, за ўвесь час канфлікту на Данбасе загінула больш за 9 тысяч чалавек, а пасля падпісання Мінска-2 — крыху больш за 200 чалавек. Кожнае страчанае жыццё — гэта велізарная трагедыя, але ж і кожны выратаваны чалавек — гэта безумоўная перамога міру і дыпламатыі!

Таму, як бы пафасна гэта ні гучала, Беларусь сёння мусіць працягваць свае нейтральныя міжнародныя намаганні і надалей выконваць ролю міждзяржаўнай і экспертнай перамоўнай пляцоўкі не толькі дзеля ўласнага дабрабыту, але і дзеля міру ў нашай частцы планеты. Гэта ўжо ў пэўнай ступені наша адказнасць перад міжнароднай супольнасцю.

Важна гэта і для нашага разумення ўласных нацыянальных інтарэсаў. Дарэчы, немагчыма не заўважаць, што сярод улад і экспертнай супольнасці на фоне ўкраінскіх падзей і рэгіянальнай дэстабілізацыі ўзнік пэўны кансэнсус наконт неабходнасці для Беларусі прытрымлівацца нейтральнага знешнепалітычнага курсу. І факт заключэння Мінска-2 гэтаму таксама паспрыяў.

Праўда, тут яшчэ патрэбна вялікая грамадская дыскусія, бо шмат хто ў нашым грамадстве па-ранейшаму схільны разглядаць міжнародныя падзеі скрозь прызму геапалітычнага супрацьстаяння: добрая Расія — дрэнны Захад ці наадварот. Рэчаіснасць пры гэтым больш складаная. Нацыянальным інтарэсам маленькай краіны, заціснутай паміж цэнтрамі геапалітычнага прыцягнення, адпавядае іншы тып мыслення: чым больш супрацоўніцтва паміж усімі, тым у большай бяспецы краіна.

**Яўген ПРЭЙГЕРМАН**

# ДЗЯЦЕЙ СА ШКОЛЫ Ў РАЦІЧАХ ПРЫНЯЛІ Ў САПОЦКІНЕ

**Як паведамляла «Звязда», 11 лютага з папярэднім дыягназам «атручванне нявысветленай этыялогіі» ў Гродзенскую абласную дзіцячую клінічную бальніцу даставілі 42 вучні са школы аграгарадка Рацічы 1998-2008 гадоў нараджэння.**

Следчыя органы праводзяць неабходныя экспертызы, каб высветліць прычыну здарэння. А што з пацярпелымі дзецьмі? **Загадчыца прыёмнага аддзялення Гродзенскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Аксана ВАРАНЦОВА** паведаміла, што ўсіх дзяцей з бальніцы ўжо выпісалі, усе яны знаходзяцца дома. Апошнім 15 лютага выпісалі, зрабіўшы неабходнае абследаванне, хлопчыка, чыя хвароба не звязана са здарэннем у Рацічах.

Што тычыцца вучэбнага працэсу, то яго ў Рацічах адразу ж пасля здарэння прыпынілі.

— Вучні першых і другіх класаў зараз на канікулах, а для астатніх 133 школьнікаў арганізавалі падвоз у сярэднюю школу гарадскога пасёлка Сапоцкін. Разам з дзецьмі адтуль ездзяць у Сапоцкінскую сярэднюю школу і іх настаўнікі, — паведаміў **намеснік старшыні Гродзенскага райвыканкама Валерый КЛІМОВІЧ.**

— Наша школа вялікая, былі вольныя кабінеты, і таму мы без усялякіх праблем для сябе прынялі дзяцей са школы ў Рацічах. Робіцца ўсё, каб у іх там былі нармальныя ўмовы для вучобы і харчавання, — зазначыла **дырэктар Сапоцкінскай сярэдняй школы Тэрэса КОДЗІК.**

Дзяцей дастаўляюць у Сапоцкін (прыкладна 9 кіламетраў ад Рацічаў) двума аўтобусамі сельгаскааператываў «Ніва» і «Гродзенскі», а пасля заканчэння заняткаў адвозяць дахаты.

*— Як прынялі вашы вучні дзяцей з іншай школы?*

— Нармальна, ніякага дыскамфорту ва ўзаемаадносінах няма. Тым больш што нашы школы размешчаны непадалёк і частка дзяцей, іх бацькоў былі дагэтуль знаёмыя, — кажа Тэрэса Іванаўна.

Такую ацэнку пацвярджае **дырэктар Рацічскай сярэдняй школы Яніна ВАЛКОЎСКАЯ.**

*— Як ставяцца вашы выхаванцы да пераезду на вучобу ў Сапоцкін?*

— Пэўна, яны ўспрынялі гэта як нейкую прыгоду.

*— А іх бацькі?*

— Мы пастаянна адсочваем сітуацыю, цікавімся ў бацькоў іх меркаваннямі. Ім практычна штодзённа тэлефануюць класныя кіраўнікі, ды і я сама. Ніводнай заўвагі з боку бацькоў не было.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*

*Па даручэнні старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Краўцова ў вобласці стварылі рабочую групу ў складзе спецыялістаў буднагляду, санітарнага кантролю, медыкаў і іншых службаў па высвятленні абставін здарэння ў школе аграгарадка Рацічы. Губернатар даручыў праверыць усе ўстановы адукацыі такога ж перыяду забудовы. Пры гэтым звярнуўшы ўвагу на адпаведнасць праектным нормам работ, што выконваліся падчас рамонту і рэканструкцыі.*

# Мокры снег з дажджом і парывісты вецер

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мокры снег, а па паўднёвым захадзе — з дажджом прагназуецца ў Беларусі ў нядзелю. Месцамі магчымы слабы галалёд, на дарогах захаваецца галалёдзіца. Чакаецца паўднёва-ўсходні парывісты вецер, удзень у асобных раёнах з парывамі да 15—17 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла. Удзень будзе ад 2 марозу да 5 цяпла, а па паўднёвым захадзе да плюс 8 градусаў.



Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня тэрыторыя Беларусі трапіць пад уплыў франтальных сістэм, якія зміяшчаюцца з боку Заходняй Еўропы, а таксама цёплых паветраных мас атлантычнага паходжання. Таму ў панядзелак чакаецца цёплае няўстойлівае надвор'е. Амаль паўсюдна пройдуць ападкі (мокры снег і дождж). Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы галалёд, на дарогах захаваецца галалёдзіца. Стане сапраўды ветрана, калі месцамі прагназуюцца парывы ветру да 15—20 м/с. Аднак пацяплее. Уначы будзе пераважна ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла, а па паўднёвым захадзе — нават да плюс 6 градусаў. Удзень будзе ўвогуле плюс 3—9 градусаў, а па поўдні месцамі да 10—12 цяпла. А гэта ўжо амаль вясна...

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды сроком на 3 (три) года недвижимого имущества, принадлежащего УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги»**

| № лота | Описание | Начальная цена продажи права, руб. | Задаток, руб. | Сумма арендной платы в месяц, базовых арендных величин |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Право заключения договора аренды части здания вокзала с инв. № 622/С-19911. Площадь, сдаваемая в аренду, – 5,9 кв.м. Адрес: Минская обл., Столбцовский р-н, г. Столбцы | 177 000 | 17 700 | 1,416 |
| Лот № 2 | Право заключения договора аренды части покрытия (асфальтобетонное покрытие с подстилкой из песка с бортовыми бетонными камнями) около пассажирского здания с инв. № 621/С-13589. Площадь, сдаваемая в аренду, – 20,0 кв.м. Адрес: Минская обл., Несвижский р-н, г.п. Городея, ул. Вокзальная, 8 | 600 000 | 60 000 | 14 |

Аукцион состоится **22.03.2016 в 11.00**, прием заявлений в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу Организатора аукциона. Окончание приема заявлений – **18.03.2016 в 12.00.**
Полный текст извещения о проведении аукциона, в том числе порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона, срок заключения договора аренды, условия оплаты, размер штрафа, содержатся на сайте Ораганизатора аукциона **ino.by**.
Все желающие могут ознакомиться со сдаваемым в аренду имуществом. Контактное лицо: Врубель Светлана Анатольевна, 8 (0163) 49-51-46.

**Организатор аукциона • адрес: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 3 этаж • +375 17 306-00-57 • +375 29 550-09-52 • + 375 29 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**


# СТАРЫЯ ЗАГАНЫ НОВЫХ ДАМОЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Любы падсобны матэрыял у руках майстрыхі ператвараецца ў арыгінальную рэч... Кватэра абстаўлена недарагой, але новай мэбляй. Для мяне было здзіўленнем, як выпускніца інтэрната, якой няма каму дапамагчы, прыстойна ўладкавала сваё жытло. І гэта стала маім першым пытаннем: «Ну вось прыйшла ты з ключом і дакументамі ў голыя сцены, і што далей?»

— На момант атрымання кватэры з асабістых рэчаў у мяне была толькі невялікая канапа. З ёй і справіла наваселле, — расказвае Ірына. — А далей ад радасці, што ёсць нарэшце свой кут, я стала працаваць у дзве, а часам нават і ў тры змены. Зарплата на фабрыцы невялікая. Калі здараліся тэрміновыя заказы і трэба было выйсці ў выхадныя, майстар ведаў, што я — першы ахвотнік. У вольны час нешта шыла знаёмым. Збірала кожную капейку. На кухонную мэблю, бытавую тэхніку афармляла крэдыт у банку. Цяпер усё самае неабходнае для жыцця ёсць.

Зараз Ірына Кушнярук знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску, гадуе дачушку. Насці днямі споўнілася два гады. А мама прапрацоўвае варыянты выхаду на работу. Месца ў садку пакуль не даюць побач — прапануюць на вуліцы Янкі Купалы, гэта даволі далёкі ад іх мікраён горада. Ірыну гатовы ўзяць у адну з швейных фірмаў, дзе зарплата значна большая, чым на фабрыцы. Але ж, калі не ўдасца на новым месцы дамовіцца пра сярэднюю змену, яна выйдзе на старое месца працы. Бо аддаваць малую ў садок з пяцідзёнкай Іра не жадае: «Гэта добрая справа, для многіх выйсце ў складаных сітуацыях, але мне нагадвае дзіцячы дом».

## Калі ў доме праблемны сусед

Знарок падрабязна расказала пра былую выхаванку інтэрната, каб падкрэсліць, што нярэдка дзетдомаўцы, пачынаючы жыццё з нуля, наладжваюць яго годна і прыстойна. Аказваецца, можна, прыйшоўшы ў голыя сцены з адным чамаданам альбо канапай, уладкаваць побыт, нават нарадзіць і выхоўваць дзіця, пры гэтым будаваць рэальныя планы надалей. Іра і на лесвічнай пляцоўцы сваёй — завадатар. Нават склала графік уборкі агульнай тэрыторыі. Але падтрымку знайшла толькі ў адных суседзяў. Двое іншых не лічаць за абавязак калі-небудзь працерці падлогу ў калідоры.

Яшчэ Ірына з вялікім шкадаваннем расказала, што сустрэла ў сваім жа доме былога аднакласніка. Увесь інтэрнат лічыў яго добрым хлопцам, а дзяўчаты заглядаліся — было на што. Нядаўна стала вядома, што ў ЖЭСе ён фігуруе як кандыдат на высяленне за свае антысацыяльныя паводзіны.



Ірына КУШНЯРУК трымае кватэру ў парадку.

**Інжынер па рабоце з насельніцтвам Брэсцкага ЖЭС-12 Святлана ГАЎРЫЛЮК** расказвае, што ў сацыяльным доме, дзе мы сустракаліся з Ірынай, праблемных — як сем'яў, так і адзінокіх жыльцоў — хапае. Напрыклад, адзін з іх (ён атрымаў кватэру ўзамен за знесенае прыватнае жыллё) вызначыўся не проста асацыяльным ладам жыцця, але і ўнушае страх суседзям. Грамадзянін меў двух сабак, якія не раз пужалі дзяцей. Суседзі звярнуліся ў міліцыю... А днямі ўчастковы спыніў спробу крадзяжу электрычнасці гэтым грамадзянінам. Нядбайнаму жыльцу даўно адключылі святло за даўгі, дык ён вырашаў праблему шляхам накідвання правадоў на агульны лічыльнік у калідоры. Адным словам, карыстаўся электрычнасцю за кошт суседзяў.

## Вэрхал у пад'ездзе і грамадская думка

Абышоўшы пад'езд, дзе жывуць і шматдзетныя сем'і, і выпускнікі інтэрнату, і, як ужо гаварылася, гараджане, чыё жыллё трапіла пад знос, мы ўпэўніліся, што некаторыя паводзяць сябе, мякка кажучы, няправільна. Таму адносна новы дом, якому ўсяго чатыры гады, выглядае бруднавата. Але апошняе аказалася кветачкамі.

«Ягадкі» неахайнасці давялося назіраць у доме №7 па вуліцы Рабінавай. Дом здадзены восенню 2014 года. Яго насельнікамі сталі выключна выпускнікі інтэрнатных устаноў, былыя дзеці-сіроты. Такім чынам за год з невялікім жыльцы здолелі развесці такі бруд на лесвіцах і пляцоўках, так папсаваць і падрапаць сцены, што зайсці сорамна. На адным з паверхаў каля трубы смеццеправода ўтварана сапраўдная звалка бытавых адходаў. А на апошнім паверсе прыкметныя сляды лакальнага пажару. Відаць, што гарэла папера альбо тканіна, і сцены засталіся закуродымленымі. Сэнсарныя выключальнікі дзе-нідзе выдраныя з правадамі. Міжволі думаеш: а што тут будзе праз дзесяць гадоў? У ЖЭСе слушна заўважылі, што іх гаспадарка мае дом 1936 года пабудовы, дзе падтрымліваецца амаль узорны санітарны стан.

— Усё залежыць ад людзей, якія пражываюць у канкрэтным пад'ездзе таго ці іншага дома, — разважае **начальнік ЖЭС-12 Аляксандр АНТАНЮК.** — Вельмі крыўдна, што сярод большасці добрасумленных і акуратных кватэраздымшчыкаў ёсць частка неахайных, не абцяжараных адказнасцю альбо звычайнай чалавечай культурай. З-за іх цень падае і на астатніх. Такім чынам ствараецца грамадская думка. Не так даўно, — працягвае Аляксандр Сцяпанавіч, — бабулькі скардзіліся на сваіх суседак. Маладыя гаспадыні сацыяльнага жылля ішлі побач з домам і елі марожанае. Потым бессаромна кінулі абгорткі на зямлю і пайшлі далей. Калі старэйшыя зрабілі заўвагу, юныя нахабна адмахнуліся: маўляў, няхай прыбіраюць тыя, хто за гэта грошы атрымлівае. Сталыя жанчыны абурыліся: «Нашы дзеці сумленна працуюць, адлічваюць падаткі, за якія дзяржава будуе жыллё сіротам, якіх дзяржава і да гэтага ўтрымлівала доўгі час. І вось такую падзяку маем мы ўсе ад гэтага кантынгенту!» Што тут скажаш?

І зноў жа нельга ўсіх мераць на адзін капыл, настойвае Аляксандр Антанюк.

— Не так даўно мы выселілі праз суд за даўгі па аплаце і асацыяльныя паводзіны аднаго жыльца. Названую кватэру атрымаў 23-гадовы хлопец са статусам сіраты. За месяц ён адмыў і аддзёр кватэру ад таго стану, да якога давёў яе папярэднік, і пачаў рамонт. Новы гаспадар працуе, раней здымаў жыллё, а цяпер гэтыя грошы ўкладвае ў сваю аднапакаёўку. І відавочна, што чалавек збіраецца ўладкаваць жыццё прыстойным чынам.

## Час пазбаўляцца ад утрыманства

Аб тым, што праблема ёсць, гаварыў з карэспандэнтам газеты і **начальнік КУП «ЖРЭУ Брэста» Павел ЗАГРАЙ.** Вырашыць яе — азначала б перавыхаваць пэўную частку людзей, прывіць ім нормы культуры, нават маралі. Такая задача для прадпрыемстваў камунальнай гаспадаркі амаль невыканальная.

Таму спецыялісты, з кім даводзілася гаварыць падчас падрыхтоўкі матэрыялу, схільныя да думкі, што наспеў час мяняць некаторыя заканадаўчыя нормы. Напрыклад, выдзяляць сацыяльныя кватэры па дагаворы, скажам, на пяць гадоў. А потым глядзець, як чалавек паводзіў сябе: ці працуе ён, ці ўносіць плату за камунальныя паслугі, ці трапляе пастаянна ў поле зроку праваахоўных органаў. А пасля прымаць рашэнне аб перадачы кватэры ў пастаяннае карыстанне. Веданне свайго часовага статусу ў валоданні жыллём падштурхнула б многіх да перагляду паводзінаў. Вядома, што ў стадыі разгляду знаходзіцца пытанне аб магчымай далейшай прыватызацыі сацыяльных кватэр. Але ж як прыватызаваць жыллё ўмоўнаму працоўнаму прыстойнаму сямейніку, калі яго пад'езд за год-два даводзіцца да стану ледзь не агульнага сметніка і няма ніякага рэальнага рычага барацьбы з нядбайнымі суседзямі? Ды і чаму нармальныя, адказныя жыльцы павінны плаціць за перыядычны рамонт пад'езду, якія нехта наўмысна псуе? (У хуткім часе кошт гэтых работ будзе раскідвацца на ўсіх і ўключацца ў жыроўкі.)

У Маскоўскім раёне Брэста, дзе знаходзіцца названы ЖЭС, пры ўручэнні ключоў ад сацыяльных кватэр праводзяць цэлае выхаваўчае мерапрыемства. Навасёлам дэманструюць відэакадры нядбайных адносінаў да жылля, паказваюць, як не трэба рабіць у новых пад'ездах. На пасяджэнні камісій у самім ЖЭСе разам з участковым, прадстаўнікамі іншых службаў выхоўваюць парушальнікаў, расказваюць пра тых, хто пазбавіўся кватэр рашэннем суда. Але гэтых мераў, як бачым, недастаткова. Трэба больш жорсткім чынам стымуляваць беражлівыя адносіны да свайго дома і пазбаўляцца ад сацыяльнага ўтрыманства.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*
**Фота Валерыя КАРАЛЯ і аўтара.**

■ Перспектывы

# СЁЛЕТА «ШТАДЛЕР МІНСК» АТРЫМАЕ ЯШЧЭ КАЛЯ 5 МЛН ЕЎРА ІНВЕСТЫЦЫЙ

## А па чыгуначнай трасе Мінск—Гомель гэтым летам пачне «лётаць» швейцарскі электрацягнік Intercity

**Асобныя аналітыкі могуць заўважыць, што ўкладанне дадатковых інвестыцый у вытворчасць электратранспарту Stadler на тэрыторыі Беларусі выглядае крыху нелагічным крокам, бо завод кампаніі тут мае цяпер пэўныя цяжкасці з заказамі. Сёння магутнасці прадпрыемства на заводзе ў Фаніпалі загружаныя на 30-40% пры максімальнай прадукцыйнасці каля 120 вагонаў у год. Але выйсце заўсёды ёсць, упэўнены старшыня праўлення і ўладальнік швейцарскай кампаніі Stadler Rail Group Петэр ШПУЛЕР, які днямі наведаў нашу краіну.**



Фота БЕЛТА.

### БУЙНЫ ЗАКАЗ — БУЙНЫЯ ГРОШЫ

Асноўны ўладальнік кампаніі лічыць, што зніжэнне курсу расійскага рубля, падзенне коштаў на нафту і газ, а таксама санкцыі супраць Расіі з боку Захаду сталі прычынай падзення рынку чыгуначнага транспарту ў краінах СНД. А гэта потым негатыўна адбілася і на дзейнасці завода «Штадлер Мінск».

Першапачаткова самым буйным заказчыкам беларускага прадпрыемства лічылася расійскі чыгуначны перавозчык «Аэраэкспрэс», які меў намер купіць 25 цягнікоў (118 двухузроўневых вагонаў) на 380 млн еўра. Такі буйны заказ забяспечваў заводу ў Фаніпалі сур'ёзныя даходы на працягу мінімум некалькіх гадоў. У самым пачатку крызісу заказ крыху падрэзалі, пакінулі 24 цягнікі. Але крызіс працягваўся, і каціроўкі расійскага рубля зніжаліся, пасля чаго «Аэраэкспрэс» быў вымушаны ўзяць паўзу і згадзіцца з фінансаваннем толькі 11 саставаў.

«Летась былі цяжкія перамовы з расійскім перавозчыкам, банкамі і страхавымі кампаніямі», — каментуе сітуацыю спадар Шпулер. — А ў выніку адна швейцарская кампанія застрахавала рызыкі і падвоіла тэрмін выплаты крэдыту, які стаў больш за 20 гадоў. А ў выніку істотна скарацілася фінансавая нагрузка на «Аэраэкспрэс», цяпер яна прымальная. У выніку 11 цягнікоў усё ж такі будуць перададзеныя ў Маскву». Атрымліваецца, што цяжкасці з першым буйным заказам практычна ўдалося вырашыць.

Больш за тое, першыя буйныя плацяжы з боку расійскіх кліентаў кампанія ўжо атрымала. Астатнюю частку гэтага заказу «Штадлер Мінск» плануе прадаць у Азербайджан, а таксама ў іншыя краіны СНД. Тры цягнікі з двухпавярховымі вагонамі ўжо ў Азербайджане, яшчэ два гатовыя да адпраўкі. Таксама існуе магчымасць, што яшчэ пяць цягнікоў гэтага класа будуць прададзеныя ў Баку. Застаецца яшчэ толькі тры цягнікі. Петэр Шпулер упэўнены, што і яны будуць рэалізаваны з цягам часу іншым заказчыкам у СНД.

### МЯСЦОВЫ РЫНАК

Існуюць у швейцарскай кампаніі пэўныя планы і па нашым рынку. У першую чаргу гэта тычыцца супрацоўніцтва з Беларускай чыгункай (БЧ), якое Шпулер ахарактарызаваў як найлепшае. Нагадаю, што сёння ўжо 16 цягнікоў Flirt працуюць у Беларусі. Стартавы заказ для БЧ на 10 так званых швейцарскіх прыгарадных электрычак стаў для кампаніі Stadler «першай ластаўкай» на рынку СНД. А цяпер на «Штадлер Мінск» праходзяць абкатку два сямівагонныя цягнікі класа Intercity.

Новы **дырэктар замежнага прадпрыемства ў Фаніпалі Філіп БРУНЕР** паведаміў карэспандэнту «Звязды», што ў цягніках класа Intercity прадугледжаны вагоны-рэстараны тыпу «бістро» з барам і афіцыянтамі. Ужо вясной гэтыя Intercity будуць перададзены Беларускай чыгунцы для канчатковай прамысловай абкаткі. Пасля гэтага ўжо праз некалькі месяцаў новы электрацягнік пачне камерцыйныя выкарыстанне па лініі Мінск—Гомель.

Мне здаецца, што агучаная падзея стане сапраўды прыемным падарункам для жыхароў гэтага паўднёвага рэгіёна, бо дабірацца адтуль да сталіцы будзе значна камфортней і хутчэй. Філіп Брунер паведаміў, што па тэхнічных параметрах гэты цягнік можа трымаць крэйсерскую скорасць каля 200 кіламетраў у гадзіну.

У сваім вытворчым партфелі швейцарская кампанія мае і сучасныя электрацягнікі гарадскіх падземных ліній. Таму фірма зацікаўлена ў пастаўках цягнікоў і для Мінскага метрапалітэна.

— Для нас было б выключна важна атрымаць заказы для метро, але пакуль ніякіх домоўленасцяў на гэты конт няма, — адзначыў дырэктар «Штадлер Мінск».

### СТАЦЬ ЛЕПШЫМ ЗАВОДАМ КАМПАНІІ

Новы кіраўнік «Штадлер Мінск» амаль упэўнены, што завод у Фаніпалі ў хуткім часе можа стаць па паказчыках якасці і фінансавай стабільнасці лепшым з усіх структурных падраздзяленняў Stadler Rail Group. Усе перадумовы дзеля гэтага існуюць, лічыць Філіп Брунер.

Сёння кіраўніцтва завода цалкам задаволена высокай кваліфікацыяй беларускіх работнікаў, іх тэхналагічнай і працоўнай дысцыплінай.

**Начальнік зборачнага цэха — намеснік дырэктара па вытворчасці завода «Штадлер Мінск» Уладзімір РУСАК** паведаміў, што пад яго кіраўніцтвам сёння працуюць 104 спецыялісты, сярэдні ўзрост якіх складае каля 30 гадоў. Першыя дакументы на тэхніку і абсталяванне былі выключна на нямецкай мове, таму мясцовыя высокакваліфікаваныя работнікі дасканала яе ведаюць.

Усяго на заводзе ў Фаніпалі працуюць толькі тры замежнікі. Астатнія — беларусы. Пераважная колькасць з іх — былыя супрацоўнікі УП «Белкамунмаш» і Мінскага вагонарамонтнага завода. Агульны штат работнікаў на прадпрыемстве пад Мінскам невялікі. Першапачаткова тут планавалася стварыць тысячу новых працоўных месцаў. Зараз, па словах дырэктара, працуюць 600 чалавек. Пры такой частковай загрузцы гэта нават зашмат. А калі пойдзе поўная загрузка магутнасцяў, то завод будзе вымушаны наймаць дадатковых работнікаў.

### ПРАЦЫ ХОПІЦЬ УСІМ

Дырэктар «Штадлер Мінск» Філіп Брунер катэгарычна абверг чуткі аб мінулых масавых скарачэннях на заводзе. Усе работнікі завода маюць кантракт, дзе прапісаны стандартныя сацыяльныя параметры, як гэтага патрабуе беларускае заканадаўства. Акрамя таго, тут для спецыялістаў кампаніі распрацаваны спецыяльныя сацыяльны пакет, дзе прадугледжваецца накіраванне работнікаў у доўгатэрміновую камандзіроўку на працу на іншы завод фірмы ў краіны Заходняй і Цэнтральнай Еўропы.

Такія камандзіроўкі прадугледжаны для захавання працоўных месцаў работнікаў, калі загрузка ў Фаніпалі недастатковая. Усяго для завода «Штадлер Мінск» было зарэзервавана 65 месцаў на прадпрыемстве кампаніі ў Польшчы, а таксама пэўная колькасць вакансій у Венгрыі і Швейцарыі. Больш за тое, асноўны ўласнік кампаніі Stadler Rail Group Петэр Шпулер вырашыў частку заказаў з іншых заводаў Еўропы перакінуць для дагрузкі на прадпрыемства ў Фаніпаль.

«Мы перакананыя, што сёлета зможам запоўніць магутнасці завода ў Беларусі. Цяпер прыкладаем сур'ёзныя намаганні, каб інтэнсіфікаваць нашы продажы на рынках. Сёння ідуць інтэнсіўныя перамовы аб тым, каб асобныя заказы перанесці з іншых заводаў на завод у Фаніпалі», — адзначае Петэр Шпулер.

### ПЛЮС НОВАЕ АБСТАЛЯВАННЕ

Кіраўніцтва швейцарскай кампаніі перакананае ў мэтазгоднасці далейшага развіцця завода «Штадлер Мінск». Не апошнюю ролю тут мае яго стратэгічнае размяшчэнне на тэрыторыі Мытнага саюза, а таксама высокі ўзровень кваліфікацыі супрацоўнікаў. Таму кампанія працягне інвестыцыі ў завод. Толькі сёлета плануецца накіраваць 4-5 млн еўра на закупку абсталявання для механічнай апрацоўкі алюмініевых профіляў.

**У цягніках класа Intercity прадугледжаны вагоны-рэстараны тыпу «бістро» з барам і афіцыянтамі.**

«Мы заўсёды атрымлівалі ўсёабдымную падтрымку як з боку ўрада, так і мясцовых улад. Мы таксама перакананыя, што палітычныя і эканамічныя крызісы калісьці павінны скончыцца, і рынкі на ўсходзе зноў павінны заквітнець», — кажа ўладальнік Stadler Rail Group.

Акрамя таго, паводле яго слоў, кампанія спадзяецца на цеснае супрацоўніцтва з холдынгам «Белкамунмаш». Адразу ўсё пачыналася з сумеснага прадпрыемства паміж «Белкамунмашам» і «Штадлерам», але эканамічная сітуацыя ў рэгіёне склалася так, што гэта СП было ліквідавана. «Мы будзем аказваць узаемную падтрымку ў плане асваення рынкаў, і «Белкамунмаш» выступіць субпастаўшчыком для вытворчасці ў Фаніпалі», — упэўнены Петэр Шпулер.

**ДАВЕДКА. Праект па стварэнні вытворчасці электрацягнікоў у Фаніпалі стартаваў у снежні 2011 года. Тады ў Беларусі было створана ААТ «Электрычны транспарт», дзе 60% акцый кампаніі належала Stadler Rail Group, астатняя частка ў выглядзе актываў холдынгу «Белкамунмаш» — Мінаблвыканкаму.**

**У 2014 годзе кампанія Stadler выкупіла астатнія 40% і стала адзіным уладальнікам акцый прадпрыемства. Усяго ў яго стварэнне Stadler інвеставаў 50 млн еўра.**

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

*Мінск—Фаніпаль—Мінск*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## СТАРТУЕ АЛІМПІЯДА ПА МЕНЕДЖМЕНЦЕ

**У межах міжнароднага Глабальнага праекта «Маладзёжны творчы рух «Эстафета якасці» сёлета Дзяржстандарт арганізуе трэцюю алімпіяду па менеджменце. Гэта мерапрыемства павінна паспрыяць павышэнню ўзроўню падрыхтоўкі маладых спецыялістаў Беларусі ў сферы развіцця творчай ініцыятывы моладзі розных краін, павелічэння якасці прадукцыі і паслуг, па лініі дасягнення ўстойлівага развіцця грамадства і паляпшэння якасці жыцця.**

У алімпіядзе могуць прыняць удзел студэнты і магістранты ўстаноў вышэйшай адукацыі краіны, а таксама спецыялісты ва ўзросце да 30 гадоў, у якіх прафесійная дзейнасць звязана з якасцю прадукцыі і паслуг. На першым этапе ўдзельнікі алімпіяды да 1 сакавіка 2016 года накіроўваюць заяўкі і рэфераты ў сваё ВНУ або ў сакратарыят Рэспубліканскай экспертнай камісіі, якія створаны на базе Дзяржстандарта і Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі (БелДІСС).

Падрыхтоўка рэфератаў можа ажыццяўляцца як асобнымі ўдзельнікамі, так і камандамі з чатырох чалавек. На другім этапе алімпіяды яго ўдзельнікі на базе БелДІСС праходзяць тэсціраванне, рашаюць сітуацыйныя задачы і прапануюць прэзентацыі на аснове сваіх рэфератаў.

Больш падрабязна аб умовах удзелу ў гэтай алімпіядзе магчыма даведацца на сайце газеты: www.zviazda.by

**Сяргей КУРКАЧ.**

## СТАЎКА НА ІМПАРТ?

**Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці праверыў 18 аптэк і ў 11 з іх выявіў парушэнні патрабаванняў Пераліку лекавых сродкаў беларускай (расійскай) вытворчасці, абавязковых для наяўнасці.**

У асобных аптэках недзяржаўнай формы ўласнасці адсутнічалі ад 1да 54 найменняў такіх лекаў. Прычым паўсюдна прапанавалі імпартныя лекавыя сродкі альбо тыя, якія пакупнік папрасіў. А інфармацыя аб перавагах лекаў айчыннай вытворчасці не прадастаўлялася. Напрыклад, у адной з гродзенскіх аптэк на зварот па пытанні набыцця смекты і но-шпы нават не паведамілі, што ў якасці альтэрнатывы ёсць беларускія прэпараты.

Па пытаннях набыцця лекавых сродкаў і аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву можна звярнуцца на «гарачую лінію» Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці (нумары тэлефонаў у Гродне 798821, 798817).

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## АРСЕНАЛ ПАСЛЯ СМЕРЦІ

**Пасля смерці свайго бацькі жыхар сталіцы кожны тыдзень заходзіў у кватэру па вуліцы Калініўскага, каб правесці ў жыллі генеральную ўборку і пазбавіцца ад непатрэбных ужо старых рэчаў. Разбіраючы іх на балконе, мужчына выраўшыў выкінуць драўляную тумбачку. Адсунуў яе, а там... граната.**

— На месца выбылі следча-аператыўная і сапёрна-піратэхнічная групы. Пры аглядзе кватэры апроч вучэбнай гранаты Ф-1 без выбуховага рэчыва былі знойдзены і іншыя боепрыпасы, — расказала **прэс-афіцэр Першамайскага РУУС г. Мінска Вольга КУЦЬКО.** — Гаворка ідзе пра малакаліберныя патроны, порах, шрот, два магазіны да аўтамата і адзін — да пісталета. А яшчэ запалы, выбуховыя пакеты, пакет з шумаімітацыяй выбуху артылерыйскага снарада і іншае. Гэтыя прадметы накіраваны на экспертызу. Мужчына патлумачыў, што яго бацька ў 1960 годзе праходзіў тэрміновую ваенную службу ў арміі і больш нідзе не служыў, у «гарачых кропках» не ваяваў. У кватэры пражываў з моманту яе пабудовы з 1968 года. Адкуль з'явіліся боепрыпасы, мінчанін не ведае.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ПАМЫЛЯЦЦА НЕ СОРАМНА: І Ў МОВЕ, І Ў ЖЫЦЦІ

TV@R

**Так лічыць Алена Трацэнка, вядучая праграм «Размаўляем па-беларуску» і «Дыяблог пра мову» на канале «Беларусь 3»**

**Між іншым, пра тэлебачанне яна ў дзяцінстве не марыла. Проста гуляла са скакалкай, трымаючы яе, як мікрафон, і спявала. Ці вершы чытала... Сёння ж у Алены хапае сіл і часу не толькі на два рэспубліканскія праекты, але і на тое, каб вышываць крыжыкам і вырошчваць кветкі на дачы. Яшчэ яна расказала мне пра сакрэты маладосці і любоў да беларускай спадчыны.**



— Думак, што я некалі буду працаваць на тэлебачанні, у мяне не было. Я ведала, што буду ці выхавальніцай у садку, ці настаўніцай у школе. У нашай сям'і рана памёр бацька, і я адразу зразумела, што трэба хутка атрымаць прафесію. Нягледзячы на тое, што гомельскую школу №26 скончыла з сярэбраным медалём, пайшла ў педагагічнае вучылішча, каб праз год і 10 месяцаў пачаць зарабляць грошы — дапамагаць маці. Мой першы аклад быў 92 рублі. У той жа час, калі глядзела тэлевізар і бачыла Кацярыну Андрэеву, якая абвяшчала праграму тэлеперадач, здавалася: і я так змагла б. І калі адвучылася ва ўніверсітэце, нарадзіла сына, працавала ў дзіцячым садку, — пачула па радыё аб'яву аб наборы дыктараў у Гомельскае абласное тэлерадыёаб'яднанне. Тады рашыла, што трэба паспрабаваць.

***— Але ж, ведаю, вы не адразу прайшлі па конкурсе?***

— Сапраўды, не з першага раза атрымалася. Мне здалося, што я спадабалася, але ўзялі Наташу Маславу. А потым яна пайшла ў дэкрэтны водпуск, і зноў спатрэбіўся дыктар. Тады, у 1995 годзе, успомнілі пра мяне. Дыкцыя ў мяне была нядрэнная заўсёды, бо з першага класа з вялікай сцэны чытала вершы і спявала. Калі патрапіла на гомельскае тэлебачанне, вельмі дапамагаў слушнымі парадамі дыктар Рыгор Капаткоў. Ён дзяліўся сваім вопытам, даваў чытаць неабходныя кнігі. Дарэчы, нас з Вольгай Карчэўскай, якая была дыктарам на рыдыё, хутка накіравалі на курсы ў Мінск. З намі працавалі Тамара Лонская і Уладзімір Баклейчаў. Яны многаму нас змаглі навучыць. Я і цяпер час ад часу раблю спецыяльную размінку для голасу і добра ведаю, калі свой голас трэба паберагчы.

***— Неспадзяванкі падчас працы былі?***

— А як без іх? Напярэдадні Новага года мяне пасадзілі чытаць аб'яву. Маімі вуснамі кіраўніцтва водаканала звярталася да грамадзян. Я так хвалявалася, што прачытала: «Паважаныя грамадзяне, не адкладайце ўсе справы на вечар 32 снежня, бо могуць здарыцца перабоі з гарачай і халоднай вадой». Так у мяне, як у Мюнхгаўзэна, з'явіўся свой лішні дзень у календары.

***— Алена, беларуская мова прыйшла ў ваша жыццё не ўчора...***

— Так, я завочна закончыла беларускае аддзяленне філфака Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Дарэчы, яго выбрала свядома — мне гэта грэла душу. Калі памятаеце, у канцы 80-х у грамадстве быў усплёск цікавасці да ўсяго беларускага. Між тым, я тады ў першую чаргу слухала сябе і не думала, што мова калісьці будзе запатрабавана... На тэлебачанні па-беларуску пачала весці навіны. Паколькі я строга стаўлюся да якасці тэксту, заўсёды папраўляла, калі мне нешта не падабалася. Бо разумела, што тыя ж выкладчыкі ўніверсітэта спытаюць менавіта з мяне. Я працавала дыктарам, але ж заўсёды разумела, што знешнасць не вечная, і трэба вучыцца далей. У адзін момант са штатнага раскладу ўвогуле знялі пасаду дыктара. Усіх дыктараў тады аўтаматычна перавялі ў рэдактары і паставілі перад фактам: хочаш працаваць — вучыся рабіць нешта яшчэ. Аказалася, што гэта вельмі цікава — пісаць тэксты. Спачатку — для праграмы «Віншую», потым я дапамагала Святлане Яўрасавай у рабоце над рэспубліканскім праектам «Дача+» — здымала асобныя сюжэты. Ну а далей была праграма «Вечарынка па пятніцах», для якой я разам з калегамі пісала сцэнарыі.

***— На ваша станаўленне — як прафесіянала і чалавека — паўплываў удзел у сацыяльным праекце «Я шукаю маці»?***

— Мы год рыхтаваліся да ўвасаблення гэтага тэлепраекта. Я ездзіла ў дзіцячыя дамы, размаўляла з іх кіраўнікамі, дамаўлялася, каб яны дазволілі нам рабіць такую праграму, якая б садзейнічала ўладкаванню дзяцей у сем'і. Дырэктары мне растлумачвалі, наколькі складанае гэта пытанне. Мэтавай аўдыторыяй той праграмы былі людзі, якія маглі б узяць дзіця на выхаванне або яго ўсынавіць. Мяне кіраўнікі дзіцячых дамоў пастаянна папярэджвалі: эмоцыі не павінны пераважваць! Браць дзіця ў парыве эмоцый нельга. Трэба разумець: не дзіця для сям'і, а сям'я для дзіцяці. Калі вы хочаце зрабіць некага шчаслівым і пры гэтым гатовыя непазбежна сутыкнуцца з вялікімі цяжкасцямі, тады бярыце дзіця і адказвайце за яго лёс. І нам, стваральнікам праграмы, нельга было заігрываць з гледачом. Мы імкнуліся падкрэсліць: увазжце свае сілы, магчымасці і цярпенне. Такія праграмы, акрамя слёз замілавання і жалю, павінны выклікаць жаданне вывучыць гэтае пытанне грунтоўна, з халоднай галавой. Урэшце, па выніках праграмы, больш за 20 дзяцей забралі ў сем'і.

***— За той абласны праект, які пачаў выходзіць у эфір раней, чым аналагічны расійскі, ваша каманда атрымала «Тэлевяршыню»...***

— Я не была гатовая да таго, што мы возьмем «Тэлевяршыню». Тады ў намінацыі ўвогуле былі моцныя праекты, і я зусім не была ўпэўнена ў перамозе. Але ж, калі гэта адбылося, вельмі ўзрадавалася. У першую чаргу не за сябе і нават не за сваю каманду. А за тое, што перамагла сацыяльна важная тэма.

***— Сёння вы робіце два вялікія рэспубліканскія праекты для канала «Беларусь 3»: «Дыяблог пра мову» і віктарыну «Размаўляем па-беларуску». Дарэчы, абодва на беларускай мове і накіраваныя на яе папулярызацыю ў грамадстве.***

— Яшчэ ў 2010 годзе гэты праект «Размаўляем па-беларуску» для абласнога эфіру прапанаваў наш тагачасны кіраўнік Віктар Котаў. Ён, рускі па нацыянальнасці, вельмі хацеў бачыць беларускамоўную праграму на тэлебачанні. Гэта была пяціхвілінная праграма, якую спачатку вёў Святаслаў Крупенька — педагог, пісьменнік, паэт, мовазнаўца. Мы рабілі невялічкія замалёўкі на нейкую вызначаную тэму — напрыклад, прывітанне ці развітанне па-беларуску. Потым праграма атрымала развіццё ў іншым фармаце. Мы шукалі розныя магчымасці, каб прыцягнуць увагу гледача да моўных праблем. Напрыклад, тлумачылі лексічныя і граматычныя асаблівасці беларускай мовы, фразеалагізмы, гаварылі пра гаспадарчыя прадметы, якімі карысталіся беларусы, іх адзенне і гэтак далей. Ну а потым ідэя спадабалася кіраўніцтву трэцяга беларускага тэлеканала. Канешне, канцэпцыю мы змянілі прынцыпова — урэшце, пакінулі толькі назву. Цяпер гэта тэлевіктарына для тых, хто вывучаў мову ў школе, але не часта карыстаецца ёю ў жыцці. Гульцы звычайна ведаюць абмежаваную колькасць беларускіх слоў, але ж яны хочуць узбагаціць слоўнікавы запас і зацікавіць астатніх. І таму ў нашай студыі не сорамна памыляцца.

***— Для праграмы «Дыяблог пра мову» вы знаходзіце вельмі цікавых суразмоўцаў, якія часта не з'яўляюцца медыйнымі асобамі. Іх, напэўна, не лёгка выцягнуць у студыю?***

— Я шчаслівы чалавек: у мяне ёсць магчымасць кантактаваць з людзьмі, якія маюць вялізны досвед у галіне мовазнаўства. Яны расказваюць гледачам шмат цікавага — такое ў інтэрнэце не знойдзеш. Я вельмі паважаю людзей, якія звязалі жыццё з вывучэннем роднай мовы. І так прыемна, калі яны, пабываўшы ў эфіры, атрымліваюць станоўчыя водгукі ад удзячных гледачоў. Раптам аказваецца, што не толькі зоркі эстрады ці спартсмены могуць быць цікавымі для тэлевізійнай публікі людзьмі, але і навукоўцы, якія валодаюць глыбокімі дасканалымі ведамі.

***— Алена, ведаю, што многія далёкія ад тэлебачання людзі здзіўляюцца, што вядучая праграмы сама выбірае тэмы, піша сцэнарый, дамаўляецца з гасцямі, растлумачвае ім умовы існавання ў кадры...***

— Падрыхтоўка праграмы займае ў 10 разоў больш часу, чым сама праграма ў эфіры. Канешне, з кожным госцем я імкнуся асабіста дамовіцца аб сустрэчы, расказаць, як апранацца, у які момант гаварыць... Я не спрабую іграць у кадры. У «Дыяблогу пра мову» я магу сказаць госцю: дапамажыце мне. Я лёгка прызнаю, што магу чагосьці не ведаць. Гледачу важна асэнсоўваць, што чалавек «з тэлевізара» такі ж, як ён сам. Для гэтага патрэбна імправізацыя ў кадры, за якой стаіць дасканалая падрыхтоўка і бездакорная работа ўсіх, хто працуе разам з табой над праграмай. Бо ў эфіры ты не павінен думаць пра тое, як у цябе ўкладзены валасы.



***— Вас хапае на што-небудзь, акрамя работы?***

— Я люблю вышываць крыжыкам. Мне падабаецца манахромная вышыўка. Я прыйшла да гэтага гады тры таму і прасіла маму, каб яна мяне навучыла. Тут ёсць нешта падобнае на стварэнне передачы. Ты доўга і ўпарта робіш усё, каб нешта атрымалася, але да самага канца не ведаеш, які будзе вынік. А потым раз — і здзяйсняецца. Мяне не хапае на вялізныя палотны, а вось мініяцюры я вышываю з задавальненнем. Яшчэ люблю ўсё, што звязана з вадой. Памыць посуд для мяне — шчасце. Вельмі люблю плаваць у басейне. Дачай займаецца мая маці, але ж я ёй таксама дапамагаю і атрымліваю задавальненне ад праполкі ці палівання раслін...

***— Самае важнае пытанне для ўсіх жанчын: што вы робіце, каб захаваць такую форму?***

— Я аптыміст па жыцці і імкнуся радавацца малому. Магчыма, таму жыццё дае мне нешта большае. Ёсць такі закон прыроды: трэба аддаваць тое, што маеш. І тады будзеш атрымліваць тое, што табе трэба. Я ніколі не баюся, што ў мяне ўзнікнуць маршчынкі. І таму заўсёды шчыра ўсміхаюся.

***— На вуліцы людзі часта пазнаюць?***

— Вітаюцца, так. І вельмі часта — па-беларуску. Летась з ансамблем «Бяседа» ездзіла па райцэнтрах Беларусі. Перад іх канцэртам праводзіла на сцэне міні-віктарыну накшталт тэлегульні «Размаўляем па-беларуску». Часта на сцэну выходзіла не шэсць чалавек, а дванаццаць. Такім чынам у мяне з'явілася многа сяброў па ўсёй краіне, і цяпер многія з іх прыязджаюць да нас на гульню.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.**
*iost@zviazda.by*



## Аўторак, 23 лютага

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40** Зона Х.
**9.10 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**10.50 Серыял «Думай як жанчына».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.25** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Пастка».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20** Сфера інтарэсаў.
**20.00 Серыял «Тальянка». 1-я серыя.**
**21.00** Панарама.
**21.45** Буйным планам.
**22.15** Урачысты сход і святочны канцэрт, прысвечаныя Дню абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.
**23.55 Кінараман «Афіцэры».**
**1.40** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.20, 17.20** «Вайна нявест». Рэаліці-шоу.
**10.00** «Чалавек-невідзімка». Рэаліці-шоу. Заключны выпуск.
**11.00, 16.15 Трылер «Закрытая школа».**
**12.05, 21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**13.10, 17.55 Дэтэктыў «Бывай, каханая».**
**14.20, 19.00 Серыял «Дружба народаў».**
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**20.00** «Дзённік экстрасэнса з Фацімой Хадуевай». Рэаліці-шоу. 1-ы выпуск.
**22.05** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.10, 0.45** Скетчкам «Рыжыя».
**22.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Першы матч. «Ювентус» — «Баварыя».
**1.10 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**

### Беларусь 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.50, 14.55, 18.20, 0.20** «Калейдаскоп».
**8.05, 19.30 «Вечны кліч». Драма.**
**9.15** «Беларускія грэнадзёры». Дак. фільм.
**9.40** 75 гадоў Акадэмічнаму ансамблю песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.
**11.20 «Транссібірскі экспрэс». Драма.**
**12.50, 23.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці дыктара Беларускага радыё і тэлебачання Уладзіміра Бузука.
**13.20** «Час кіно».
**13.30 «Таму што кахаю». Кінааповесць.**
**15.10** «Кіно і час». Брэсцкі мір.
**15.50 «Шчыт Айчыны». Маст. фільм.**
**17.10** «Якаў Крэйзер. Забыты генерал». Дак. фільм.
**17.50, 23.25** «Дыя@блог». «Пра вечнае».
**18.35** «Размаўляем па-беларуску».
**18.40, 21.40** «Загадкі рускай гісторыі». 1-я і 2-я серыі.
**20.40** «Калыханка».
**21.55 «07 змяняе курс». Маст. фільм.**

### Беларусь 5

**7.35** PRO спорт. Вынікі.
**8.00** Баскетбол. НБА. «Аклахома» — «Кліўленд».
**9.45** Футзала. Кубак Беларусі. Фінал.
**11.20** Спорт-мікс.
**11.40** «Спорт, спорт, спорт». Святлана Бурдзявіцкая.
**12.10** Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. 1/4 фіналу. Першы матч.
**14.05** Лёгкая атлетыка. Зімовы чэмпіянат Беларусі.
**18.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**18.45** Спорт-кадр.
**19.15, 22.20** PRO спорт. Навіны.
**19.25** Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. 1/4 фіналу. Другі матч.
**21.40** Місія Рыа-2016. Відэачасопіс.
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Першы матч. «Арсенал» (Англія) — «Барселона» (Іспанія).
**0.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Першы матч. «Ювентус» (Італія) — «Баварыя» (Германія).

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Геніі і злыдзеі».
**9.50, 11.10 Кіно ў колеры. Маст. фільм «Нябесны ціхаход».**
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.30, 13.10 Маст. фільм «Дыверсант».**
**15.40, 16.20 Легендарнае кіно ў колеры. Маст. фільм «Афіцэры».**
**18.20** Канцэрт, прысвечаны 45-годдзю фільма «Афіцэры».
**20.00** Час.
**21.05 Маст. фільм «Бітва за Севастопаль». Поўная версія.**



**0.35** Прэмія «Залаты арол-2015». «Янкоўскі».
**2.05** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Трылер «Улада забойцаў».**
**10.20** «Далёкія сваякі».
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
12.30 «Салдаты Радзімы». Дак. фільм.
**13.50** «Наша справа».
**14.05, 23.40 «Маёр Ветраў». Серыял.**
**16.00** «Вадзіць па-руску».
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Драма «72 метры».**
**22.20** «Глядзець усім!»
**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**23.20** «Аўтапанарама».
**1.30** «Дакументальны спецпраект»: «Дзень шакіруючых гіпотэз».

### МІР

**6.00** М/ф.
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15 Маст. фільм «Гардэмарыны, наперад!».**
**15.35, 16.15, 17.10 Маст. фільм «Віват, Гардэмарыны!».**
**19.20 Серыял «Пакуль цвіце папараць».**
**22.00 Маст. фільм «Загадана жаніць».**
**23.55** Фестываль Аўтарадыё «Дыскатэка 80-х».
**2.45 Маст. фільм «Суперцешча для няўдачніка».**
**4.05 Маст. фільм «Аляксандр Неўскі».**

### РТР—Беларусь

**7.00 Камедыя «Сем нявест яфрэйтара Збруева».**
**8.35 Маст. фільм «Дарагі мой чалавек».**
**10.25 Маст. фільм «Афіцэры».**
**12.00, 14.15 Маст. фільм «Смяротная схватка».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**15.30** «Пакой смеху».
**17.00, 20.55, 23.10 Серыял «Ліквідацыя».**
**23.40** Святочны канцэрт да Дня абаронцы Айчыны.

### НТБ—Беларусь

**6.20** «Астрапрагноз».
**6.25, 8.20, 10.20, 13.20 Серыял «Браценікі».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**15.25, 16.20, 19.20 Серыял «Бамбіла».**
**22.40 Серыял «Марскія д'яблы. Лёсы».**
**0.25 Серыял «Глухар. Працяг».**

### 8 канал

**7.00, 14.10, 19.45, 21.00, 23.45** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.50 Серыял «Песня лёду і полымя».**
**8.30 Серыял «Каханне імператрыцы».**
**9.35, 12.55, 13.55, 15.45, 16.30, 18.25, 19.35, 20.55** «Хатняя крама».
**9.45** «Мой любімы гадаванец».
**10.15** Дак. фільм «Тэрыторыя міру».
**11.10 Драма «Кандагар».**
**13.00 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».**
**14.15 Серыял «Каханне і страх».**
**16.15** «Кінаблакнот».
**16.45 Драма «Афіцэры».**
**18.30 Серыял «Канвой».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Драма «Красная плошча».**

### ВТБ

**6.00, 17.00, 0.00** «Лаві момант».
**6.30, 23.10, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**8.00, 13.10** «Ералаш».
**8.30, 18.00, 23.30** Серыял «Два бацькі і два сыны».
**9.30, 14.00, 19.00** Серыял «Мамачкі».
**10.30, 15.00, 20.00** Серыял «Маладзёжка 3».
**11.30** Меладрама «Каханне з рызыкай для жыцця».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.30, 0.30, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**21.10** «Уральскія пельмені». Крокам фарш.
**1.00, 3.30** «Дурні і дарогі».
**1.30** Серыял «Нямы сведка».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Знішчальнікі». Маст. фільм.
**11.35** Больш чым каханне. Марк Бернэс і Лілія Бадрова.
**12.20** «Казьма Кручкоў і іншыя героі». Дак. фільм.
**12.50, 1.55** «Каштоўныя паланцы кветак». Дак. фільм.
**13.45** «Ехаў Грэка... Залатое кальцо — у пошуках сапраўднай Расіі». Дак. серыял.
**14.25** «Агеньчык. Нятленка».
**17.30** «Бег». Маст. фільм.
**20.35** «Тыя, з якімі я... Рускі мужык Міхаіл Ульянаў».
**21.55** «Любімыя песні». Васіль Герэла, Фабія Мастранджэла і аркестр «Руская філармонія» ў Дзяржаўным Крамлёўскім палацы.
**23.20** «Марыя Палякова. Свая сярод чужых». Дак. фільм.
**0.15** «Справа №306». Маст. фільм.
**1.35** «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан». «Маё жыццё». М/ф для дарослых.
**2.50** «Фрэнсіс Бэкан». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Акулы пяра». Аляксандр Новікаў. 1996 год.
**6.45, 8.15, 8.45, 11.00, 14.30, 15.40, 17.00, 18.45, 20.10, 21.40, 23.00, 1.20, 2.45, 5.00** Музычная настальгія.
**7.00** «Зямля-Паветра». Гурт «Ленінград». 2001 год.
**8.40** М/ф «Машаччын канцэрт».
**9.00** Фільм-канцэрт «Адлігa». Юрый Шаўчук і гурт «ДДТ». 1988 год.
**10.00** Маст. фільм «Аўтапартрэт невядомага».
**12.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Вайсковыя байкі». Максім Капітаноўскі, Аляксандр Маршал. 2005 год.
**13.10** Маст. фільм «Аты-баты, ішлі салдаты».
**14.45, 20.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!»
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00** «Народжаны ў СССР».
**18.00** «Акулы пяра». Мікалай Растаргуеў.
**19.00** Маст. фільм «Не плач, дзяўчынка!».
**0.00** «Зямля-Паветра». Данка. 2003 год.
**2.30** М/ф «Цудоўны званочак».
**3.00** «Быў час». 2009 год.
**4.00** Маст. фільм «Вы Пецьку не бачылі?».

### EuroSport 1

**3.30, 9.30** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Уэльса. Фінал.
**5.00, 7.30, 8.30, 13.30, 17.30, 20.15, 1.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**6.00, 12.30, 15.15** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**6.45, 10.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны.
**8.00, 8.25** Футбол. Еўрагалы.
**8.05** Яго Вялікасць футбол.
**10.30** Watts.
**11.30** Зімовыя віды спорту.
**14.15, 16.15, 22.45** Лыжнае дваябор'е. Кубак свету.
**18.45, 0.00, 2.30** Горныя лыжы. Кубак свету.
**0.45** Аўта- і мотаспорт. Акадэмія GT.

### Камедыя

**0.45** Камедыя «Укол парасонам».
**2.20** Меладрама «Купі, пазыч, укрАдзі».
**4.05** Меладрама «10 дзён каб закахацца».
**5.40, 21.30** Меладрама «(Не) чаканы прынц».
**7.15** Камедыя «Люблю цябе на ўсіх мовах свету».
**9.00** Камедыя «Зануда».
**10.40** Камедыя «Вясёлыя і загарэлыя».
**12.25** Камедыя «Улётны рэйс».
**14.00, 14.50, 15.40, 17.40** Скетчкам «Паміж намі».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Пазнаёмцеся з Уолі Спарксам».



**18.00** Камедыя «Патрабуюцца карэктныя паводзіны».
**19.40** Меладрама «Былыя: лепшыя сябры!».
**23.05** Камедыя «Няхай жыве Францыя!».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.50** «Доктар І...»
**8.15, 19.00, 0.55** «Іфет». Серыял.
**9.50, 3.15** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.40, 4.00** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.40, 16.05** «Хатні рэстаран».
**12.35, 2.30** «Нераскрытыя тайны».
**13.30, 17.55** «Пятая варта». Серыял.
**14.30, 4.50** «Псіхасаматыка».
**15.05** «Prокіно».
**15.15** «Мой герой».
**17.00, 21.50** «Белая гвардыя». Серыял.
**20.55, 0.10** «Блудныя дзеці». Серыял.
**22.40, 5.15** «Зоркі і містыка».
**23.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.00** Драма «Новая спроба Кейт Макол».
**8.00** Прыгоды «Пачатак часоў».
**10.00** Драма «1+1».
**11.50** Прыгоды «Буйная рыба».
**14.00** Драма «Залатое стагоддзе».
**16.00** Меладрама «Версальскі раман».
**18.00** Драма «Куды прыводзяць мары».
**20.00** Драма «Жнівень».
**22.10** Камедыя «Вялікі тата».
**23.50** Трылер «Драйвер на ноч».
**1.30** Драма «Змоўшчыца».
**3.40** Меладрама «Эрын Брокавіч — прыгожая і рашучая».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.05** Трылер «Вій».
**8.30, 2.20** Камедыя «Тата напракат».
**10.10, 4.20** Меладрама «Атаманы Іван».
**12.20** Старое добрае кіно. Трагікамедыя «Яно».
**14.30** Камедыя «Англійская руская».
**16.10** Драма «Час пік».
**20.20** Трылер «Шпіён».



**22.20** Трылер «Уцекачы».
**0.20** Баявік «Антыкілер».

### National Geographic

**6.00, 7.35, 13.10, 17.50, 21.00, 0.55, 4.00, 5.30** Гульні розуму.
**6.50** Займальная навука.
**8.20, 18.40, 21.45, 1.40, 4.50** Шырокі погляд.
**9.10, 14.00, 19.30** Злавіць кантрабандыста.
**10.00, 12.20, 14.45, 20.10, 0.10, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.
**10.45** Дзікі тунец.
**11.35** Шаша праз пекла.
**15.30** На плітах па Юкане.
**16.20** Інстынкт выжывання.
**17.05** Супербудаванні Трэцяга рэйха.
**22.35** Код небяспекі.
**23.00** Навуковыя недарэчнасці.
**23.20, 2.30** Паранармальнае.

### Discovery

**8.00, 12.30** Хуткія і гучныя.
**8.50** Што было далей?
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40, 17.05** Багажныя войны.
**11.35, 7.10** Драпежнікі буйным планам.
**13.25, 6.25** Забойныя дылемы.
**15.15, 1.00, 5.35** Страсць да матораў.
**16.10, 3.00** Вялікі махінатар.
**18.00** Мужчыны, жанчыны, прырода.
**19.00** «Зорнае выжыванне» з Беарам Грылсам.
**20.00** «Востраў» з Беарам Грылсам.
**22.00** Таргі без тармазоў.
**23.00** У пагоні за класікай.
**0.00** З-за цягі да машын.
**2.00, 4.50** Бітва за нерухомасць.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.

# Хачу стаць «міс»,

## або Прыгажосць па-беларуску

**Будучыя эканамісты, урачы, праграмісты, бухгалтары, харэографы, мастакі, будаўнікі і нават майстры спорту па плаванні — усіх іх нядаўна аб'яднала адна агульная мэта — стаць «Міс Беларусь — 2016».**



Чатырыста дзяўчат з розных куткоў Беларусі з'ехаліся ў сталічную Нацыянальную школу прыгажосці, каб пачуць ад журы адбору: «Вы праходзіце!». Аднак адной толькі прыгажосці для гэтага, як аказалася, недастаткова. Каб адпавядаць тытулу галоўнай прыгажуні краіны, патрэбны яшчэ як мінімум шырокі кругагляд і ўменне здзіўляць.

Як адзначыла дырэктар дырэкцыі спецпраектаў тэлеканала АНТ Анжаліна Мікульская, сёлета ўсё на конкурсе будзе зроблены на беларускую мову, культуру, гісторыю, нацыянальныя касцюмы. «Гэтая тэма пройдзе праз увесь конкурс. Рыхтуем шмат сюрпрызаў! Пераможца конкурсу атрымае карону, грашовы прыз і самае галоўнае — права прадстаўляць нашу краіну на конкурсе «Міс свету», — падзялілася Анжаліна Мікульская.

У журы кастынгу — прадзюсарская група тэлеканала АНТ, дырэктары мадэльных агенцтваў і прадстаўнікі шоу-бізнесу. А за кулісамі дзяўчаты прызнаваліся, што самыя каверзныя пытанні ім задаваў вядучы АНТ Дзяніс Кур'ян. За два дні кастынгу адбор прайшлі чатыры сотні дзяўчат. Імёны 25 удзельніц стануць вядомыя праз тры тыдні. За падрыхтоўкай да конкурсу можна будзе сачыць у дзённіках у эфіры АНТ і на сайце ONT.BY. Імя прыгажуні, якая атрымае карону і тытул «Міс Беларусь — 2016», даведацца зможам толькі ў маі.

# Трэці дзень народзінаў у «Беларусь 3»

**Тры гады таму, у лютым, тэлеканал «Беларусь 3» паспяхова стартаваў у эфіры і сёння з'яўляецца платформай для творчай і інтэлектуальнай эліты. Канал стаў неад'емнай часткай мастацкага і культурнага жыцця краіны.**

«Беларусь 3» — першы сацыякультурны канал у краіне, мэта якога асвятляць культурнае жыццё краіны. Адной з асаблівасцяў «Беларусь 3» можна лічыць імкненне ўсё больш размаўляць з гледачамі па-беларуску. У эфіры прадстаўлена музычнае і тэатральнае мастацтва: здымаюцца і трансліруюцца канцэрты, спектаклі, творчыя сустрэчы. Заўсёды можна ўбачыць цікавыя прэм'еры: оперы, тэатральныя праекты, канцэрты. Таксама прысутнічаюць мастацкія фільмы і экранізацыі класічных літаратурных твораў, стужкі айчынных і замежных рэжысёраў, якія сталі класікай кінематографа. Праграмы тэлеканала даступныя анлайн на сайце www.3belarus.by. Акрамя таго, на афіцыйным інтэрнэт-канале на YouTube.com можна паглядзець упадабаныя перадачы, альбо выпускі праектаў. Дарэчы, па выніках даследаванняў, асаблівай папулярнасцю ў інтэрнэце карыстаюцца праграмы «Подых струн», «Размаўляем па-беларуску», «Бард-парад», хіт-парад «Сто песень для Беларусі», «Камертон», «Дыяблог» і «Наперад у мінулае». У будучым «Беларусь 3» збіраецца ажыццявіць яшчэ шмат цікавых ідэй.

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** Давядзецца вывучаць новы для сябе кірунак дзейнасці, засвойваць чужую мудрасць і веды. Не варта прапускаць гэты працэс, бо пасля прыйдзецца вытрымаць іспыт. Магчымы актыўныя перамяшчэнні і кантакты з вялікай колькасцю незнаёмых людзей. Другая палова тыдня будзе напружанай, спатрэбіцца шмат сіл. Неабходна будзе прадэманстраваць сябе з найлепшага боку. Гэтым будуць закладзены асновы для далейшага фінансавага развіцця.



**СКАРПІЁН.** Цяжкі перыяд застаецца ззаду, і перад вамі адкрываюцца новыя магчымасці. Тыдзень будзе багаты на новыя ідэі і актыўную дзейнасць, што дазволіць рушыць да новых мэтаў і ў хуткім часе дасягнуць іх. Каб не натыкацца на перашкоды, вам неабходна імкнуцца да таго, чаго ў вас яшчэ не было ў жыцці, і што не будзе чапляцца за вашы старыя няўдачы. Але непасрэдныя стасункі з людзьмі варта звесці да мінімуму, інакш не пазбегнуць рознагалоссяў і спрэчак.



**СТРАЛЕЦ.** Тыдзень станоўчай дынамікі. Усё адбываецца раптоўна і не па плане, але складваецца ўдала, можна нават сказаць, што найлепшым чынам. Таму не варта планаваць нейкія асабліва важныя справы, даверцеся лёсу і атрымлівайце асалоду ад таго, што адбываецца. Тыдзень асабліва паспяховы ў пытаннях, звязаных з адносінамі. На ўсталяванне трывалых сувязяў і кантактаў разлічваць не варта, але вось для розных мерапрыемстваў, сяброўскіх сустрэч і весялосці час самы адпаведны.



**КАЗЯРОГ.** Тыдзень будзе звязаны з усталяваннем кантактаў і заключэннем здзелак. Не выключана ўзнікненне і спрэчных момантаў, што можа спарадзіць рознагалоссі бліжэй да канца тыдня. Дакладна трымайцеся ўстаноўленага плана і тады можаце разлічваць на поспех. Неабходна, каб на ўсім быў парадак, нельга спадзявацца на шчаслівы выпадак ці ўдалы збег абставін — падзеі тыдня падлягаюць строгай рэгламентацыі.



**ВАДАЛЕЙ.** Нягледзячы на тое, што будуць схільныя лунаць у аблоках і аддавацца рознага роду фантазіям, вам рэкамендуецца заняцца надзённымі праблемамі і не адхіляцца. Назапасілася маса спраў, якія альбо пачаты і не скончаны, альбо і зусім не пачаты, таму неабходна сабрацца з сіламі і давесці іх да ладу. Разлічваць на падтрымку з боку іншых людзей не варта, бо, хутчэй за ўсё, сябры і прыяцелі вас будуць толькі адцягваць, даючы пры гэтым абсалютна непрымальныя парады. Трэба засяродзіцца і зрабіць усё самому.



**РЫБЫ.** Тыдзень спрыяльны, але толькі ў тым выпадку, калі не будзеце спрабаваць нешта пачаць або займацца актыўнай дзейнасцю. Прысвяціце час сабе, сваім жаданням, мары. Пашукайце ўнутраную гармонію, папесціце сябе. Адключыце разумовы працэс і дазвольце сабе ні пра што не думаць. Абстаноўка дазволіць вам не напружвацца і не марнаваць сілы. Ні ў што не ўмешвайцеся і зможаце здабыць гармонію з сабой, аднавіць свае асабістыя сілы.

## Чацвер, 25 лютага

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.20** Зона Х.
**9.10, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**10.50 Серыял «Думай як жанчына».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.25** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Пастка».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 23.40** Сфера інтарэсаў.
**20.00, 0.30 Серыял «Тальянка».**
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**0.20** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.10, 17.20** «Вайна нявест». Рэаліці-шоу.
**9.50, 16.15 Трылер «Закрытая школа».**
**10.55, 20.00** «Дзённік экстрасэнса з Фацімой Хадуевай». Рэаліці-шоу.
**12.05, 21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**13.10, 17.55 Дэтэктыў «Бывай, каханая».**
**14.20, 19.00 Серыял «Дружба народаў».**
**15.30, 22.45** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**22.05** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.15, 23.40** Скетчкам «Рыжыя».
**0.10 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**

### Беларусь 3

**7.25** «Дабрананак».
**8.00, 12.40, 18.15, 0.20** «Калейдаскоп».
**8.15, 12.55, 18.30** «Размаўляем па-беларуску».
**8.25, 19.30 «Вечны ключ». Драма.**
**9.35** «Свет прыроды». Вярхоўе ракі Ловаць.
**10.00 «Стэп». Драма.**
**12.10, 23.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці пісьменніка, літаратурнага крытыка Уладзіміра Карпава.
**13.05 «Палігон». Драма.**
**15.15** «Сіла веры».
**15.45 «Пачуцце». Драма.**
**17.45, 23.30** «Навукаманія». Нанатэхналогіі: гісторыя пытання.
**18.40, 21.40** «Загадкі рускай гісторыі».
**20.40** «Калыханка».
**21.50 «Для тых, хто пачынае кахаць». Меладрама.**

### Беларусь 5

**7.35, 18.30, 23.45** PRO спорт. Навіны.
**7.50** Баскетбол. НБА. «Чыкага» — «Вашынгтон».
**9.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Першыя матчы. Агляд.
**10.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Першы матч. «Дынама» (Кіеў, Украіна) — «Манчэстэр Сіці» (Англія).
**12.00** Спорт-мікс.
**12.20** Слэм-данк.
**12.50** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы. Спрынт. Жанчыны.
**14.25** Баскетбол. Кваліфікацыя да Еўра-2017. Жанчыны. Беларусь — Польшча.
**15.50** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы. Спрынт. Мужчыны.
**17.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**17.55** «Спорт, спорт, спорт». Ірына Ушакова.
**18.40** Хакей. Белнафтахім — чэмпіянат Беларусі. 1/4 фіналу. Другі матч.
**20.55, 23.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/16 фіналу. Матч у адказ.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.35** «Бесталковыя нататкі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10** «Час пакажа».
**16.20** «Таблетка».
**16.55** «Давай пажанімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Трэба разабрацца».
**21.30 Серыял «Сямейны альбом».**
**23.25 Маст. фільм «Дзяржаўная мяжа. Год сорак першы».**
**1.50** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Драма «Пакой Марвіна».**
**10.10** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!»
**13.50, 23.40 «Баец». Серыял.**
**15.35** «Самая карысная праграма».
**16.50** «Ведай нашых!»
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Настаўнік года».**
**22.10** «Глядзець усім!»
**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.

**23.20** «Аўтапанарама».
**1.20** «Тайны Чапман».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Зроблена ў СССР».
**9.30 Маст. фільм «Жорсткі раманс».**
**12.10** Дак. фільм «З нагоды». Водар кахання: Гісторыя парфумерыі.
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** Кулінарнае шоу «Цяжар абеду».
**13.45, 3.35 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».**
**14.15, 20.10 Серыял «Развод».**
**15.10, 5.00** «Справы сямейныя».
**16.20** Дак. цыкл «Тайны Расіі».
**17.20, 19.20 Серыял «Хто, калі не я?».**
**21.05 Маст. фільм «У добры час».**
**23.00 Серыял «Кароткі курс шчаслівага жыцця».**
**23.55** Галоўная тэма.
**0.10** Ток-шоу «Слова за слова».
**1.05 Маст. фільм «Гардэмарыны, напэрад!».**
**4.05** Дак. серыял «Іншы свет».
**4.35** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Уся Расія».
**12.00** «Іду на таран». «Як яно ёсць. Хлеб».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Прынцып Хабарава».**
**19.10, 20.55 Серыял «Самара-2».**
**22.00, 23.10 Серыял «Залатая клетка».**
**23.50** «Паядынак».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10 Серыял «Сужэнцы».**
**7.10** «Цуд тэхнікі».
**8.05** «Раніца з Юліяй Высоцкай».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Святло і цень маяка».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.10 Серыял «Браценікі».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.45 Серыял «Пчаляр».**
**21.30, 23.00 Серыял «Бамбіла. Працяг».**
**22.30** «Вынікі дня».
**23.50 Серыял «Глухар. Працяг».**

### 8 канал

**7.00, 14.10, 19.45, 21.00, 23.45** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.50 Серыял «Песня лёду і полымя».**
**8.30, 18.30 Серыял «Канвой».**
**9.25** Дак. фільм «Невядомая бітва Георгія Жукава».
**10.45** «Кінаблакнот».
**11.00 Драма «Аперацыя Валькірыя».**
**12.55, 13.55, 15.45, 16.50, 18.25, 20.55** «Хатняя крама».
**13.05 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».**
**14.15 Серыял «Каханне і страх».**
**16.20** «Мой любімы гадавальнец».
**17.00 Драма «Тарпеданосцы».**
**19.35** «Фэшн is my прафэшн».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Драма «Экіпаж».**

### ВТБ

**6.00, 17.00, 0.00** «Лаві момант».
**6.30, 23.10, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**8.00, 13.35** «Ералаш».
**8.30, 18.00, 23.30** Серыял «Два бацькі і два сыны».
**9.30, 14.00, 19.00** Серыял «Мамачкі».
**10.30, 15.00, 20.00** Серыял «Маладзёжка 3».
**11.30** Камедыя «Горка!».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.30, 0.30, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**21.10** Камедыя «Горка! 2».
**1.00, 3.30** «Дурні і дарогі».
**1.30** Серыял «Нямы сведка».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15** «Вяртанне Сюркуфа. Гром над Індыйскім акіянам». Маст. фільм.
**12.55** «Расія, любоў мая!». «Свет Чукоткі».
**13.20** «Дзень шчасця». Маст. фільм.
**15.10** «Абсалютны слых».
**15.50** «Згублены свет закрытых гарадоў». Дак. фільм.
**16.30** «95 гадоў з дня нараджэння Рамана Качанава. «Найлепшы сябар Чабурашкі». Дак. фільм.
**17.10** «Прынашэнне Алене Абразцовай». Гала-канцэрт Музычнага фестывалю Васіля Ладзюка.
**18.35** «Крыштальныя дажджы. Тацццяна Пілецкая». Дак. фільм.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**20.45** «Правілы жыцця».
**21.10** Сусветныя скарбы.
**21.25** «Культурная рэвалюцыя».
**22.15** «Барыс Дабрадзееў. «Масфільм» на вятрах гісторыі. Ад Сталіна да Хрушчова. Пагляд праз гады». Дак. фільм. Частка 2-я.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** «Бег». Маст. фільм. 2-я серыя.
**1.30** Б. Барток. Канцэрт № 1 для фартэпіяна з аркестрам.

### Настальгія

**6.00** «Акулы пяра». Мікалай Растаргуеў.
**6.45, 8.10, 9.40, 11.00, 12.45, 14.20, 15.40, 17.00, 18.50, 20.20, 21.40, 23.00, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.00** Маст. фільм «Не плач, дзяўчынка!»
**8.45, 14.45, 20.45, 2.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!»
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітковскім. «Вясновы заклік». 2007 год.
**13.00** Маст. фільм «За твой лёс».
**18.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага рока». «Акварыум. Мы ніколі не станем старэйшымі». 3-я частка. 2007 год.
**19.10** Маст. фільм «Добрыя намеры».
**0.00** «СеўАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Вайсковыя байкі». Максім Капітаноўскі, Аляксандр Маршал. 2005 год.
**1.10** Маст. фільм «Аты-баты, ішлі салдаты».

### EuroSport 1

**3.30, 3.55, 11.30, 11.55** Футбол. Еўрагалы.
**3.35, 11.35** Яго Вялікасць футбол.
**4.00, 8.00, 2.35** Горныя лыжы. Кубак свету.
**5.00, 9.00, 15.00, 20.30, 23.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**6.00, 12.00** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы.
**10.30, 14.30, 17.30, 0.00** Лыжнае двааборʼе. Кубак свету.
**13.00, 18.00, 21.15, 1.05** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны.
**14.15** Watts.
**16.00, 22.05, 1.50** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны.
**19.00, 19.55** Футбол. Сусветныя галы.
**19.05** Футбол. Лаціна.
**19.30** Футбол. ФІФА.
**20.00** Скачкі. НН the Emir's Trophy.

### Камедыя

**0.45** Меладрама «(Не)чаканы прынц».
**2.15** Камедыя «Няхай жыве Францыя!».
**4.00** Камедыя «Я вяртаюся да мамы».
**5.40, 21.30** Камедыя «Занудa».
**7.15** Камедыя «Пазнаёмцеся з Уолі Спарксам».
**9.00** Камедыя «Патрабуюцца карэктныя паводзіны».
**10.40** Меладрама «Былыя: найлепшыя сябры!».
**12.25** Камедыя «Дзіўныя сваякі».
**14.00, 14.50, 15.40, 17.40** Скетчком «Паміж намі».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Меладрама «Каханне жыве тры гады».
**18.00** Камедыя «Бос у гасцінай».
**19.40** Камедыя «Пяць нявест».
**23.05** Камедыя «Вясёлыя і загарэлыя».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.55** «Доктар І...»
**8.20, 18.55, 1.10** «Іфет». Серыял.
**9.55, 3.35** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.45, 4.20** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.45, 16.00** «Хатні рэстаран».
**12.40, 2.50** «Нераскрытыя тайны».
**13.35, 17.50** «Пятая варта». Серыял.
**14.35** «Псіхасаматыка».
**15.10** «Мой герой».
**16.55, 21.50** «Белая гвардыя». Серыял.
**20.55, 0.25** «Блудныя дзеці». Серыял.
**22.40, 5.15** «Зоркі і містыка».
**23.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**0.15** «Рокіна».

### ТБ1000

**6.00** Меладрама «Іспанская—англійская».
**8.10** Камедыя «Сцюарт Літл».
**9.40** Драма «Дзіяна: Гісторыя кахання».
**11.30** Драма «Пробліск геніяльнасці».
**13.30** Драма «Народжаны чацвёртага ліпеня».
**16.00** Драма «Сацыяльная сетка».
**18.00** Баявік «У промнях славы».
**20.00, 3.30** Драма «Падмена».
**22.30** Фэнтэзі «Іншы свет: Паўстанне ліканаў».
**0.00** Драма «Лофт».
**1.50** Камедыя «Зводныя браты».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Драма «Ахоўвай мяне, мой талісман».
**7.40, 2.00** Меладрама «Іваноў».
**10.40, 5.00** Трагікамедыя «Пра жонку, мару і яшчэ адну...»
**12.20** Старое добрае кіно. Фантастыка «Падзямелле ведзьмаў».
**14.20** Трылер «Шпіён».
**16.20** Трылер «Уцекачы».
**17.55** Дэтэктыў «Дзесяць негрыцянят».
**20.20** Меладрама «Забаронена».
**22.30** Камедыя «Сірата казанская».
**0.20** Камедыя «Жанчыны супраць мужчын».

### National Geographic

**6.00, 13.10, 5.30** Гульні розуму.
**6.50** Займальная навука.
**7.10** Папулярная навука.
**7.35, 17.50, 21.00, 0.55, 4.00** Золата ў халоднай вадзе.
**8.20, 18.40, 21.45, 1.40, 4.50** Верф.
**9.10, 14.00, 19.30** Аўта-SOS.
**10.00, 14.45, 20.10** Сапраўдны суперкар.
**10.45** Дзікі тунец.
**11.35** Шаша праз пекла.
**12.20, 0.10, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.
**15.30** На плытах па Юкане.
**16.20** Інстынкт выжывання.
**17.05** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**22.35** Код небяспекі.
**23.00** Навуковыя недарэчнасці.
**23.20, 2.30** У пошуках праўды.

### Discovery

**8.00, 12.30** Кубінскі хром.
**8.50** І зноў не спрабуйце паўтарыць.
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40, 17.05** Паляўнічыя на рэліквіі.
**11.35, 7.10** Голыя і напалоханыя XL.
**13.25, 6.25** Трой.
**15.15, 5.35** Мяцежны гараж.
**16.10, 3.00** Вялікі махінатар.
**18.00** Ліквідатар.
**19.00** Паляўнічыя на старызну.
**20.00** Стальныя хлопцы.
**22.00** Залатая ліхаманка.
**23.00** Паляўнічыя на рачныя алмазы.
**0.00** Паляванне на труфелі.
**1.00** Выжыць у дзікіх умовах.
**2.00, 4.50** Скарбашукальнікі Амерыкі.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.




# КАТКОЎ

## Словы пра мастака і настаўніка Сяргея Каткова

### СВЯТЛО

У студыі Сяргея Пятровіча Каткова было шмат святла. Вокны першага доўгага памяшкання выходзілі на поўдзень. У паўднёвым святле працавала малодшая група. Старэйшыя студыйцы займаліся ў квадратным памяшканні з вокнамі на поўнач. Паміж памяшканнямі меўся высокі, да самай столі, шырокі прагал, так што ў студыі Каткова паўночнае прахалоднае святло змешвалася з цёплым паўднёвым. Ад гэтага там было шмат рэфлексаў, шмат паўтаноў, што надавалі студыі і студыйцам святочны настрой.

### ПЕРШАЯ КАРЦІНА

Маляваў я з самага ранняга дзяцінства. Маляваў для таты, каб маці ўкладала мае малюнкі ў лісты, што адсылала ў Маскву, дзе наш бацька вучыўся ў інстытуце на вышэйшых літаратурных курсах. Маляваў я шмат, але першую карціну паспрабаваў зрабіць толькі ў трэцім класе, калі прыйшоў у студыю да Сяргея Пятровіча Каткова. Там дзеці малявалі на вялікіх аркушах; такі бязмежны, як тады падавалася, аркуш узяў і я. У левым ніжнім кутку я намаляваў славянскага асілка з кап'ём, а ў правым — пачвару — чорта-татарына з крывой шабляй. Воіны стаялі ў чаканні двубою. Вялікае поле густа-зялёнай травы я паспрабаваў намаляваць маленечкім пэндзлікам. За першы свой дзень у студыі я зафарбаваў толькі трэць аркуша і моцна заперажываў, што не паспею скончыць карціну за адзін сеанс. У памяці мая першая карціна з Асілкам ды Пачварнікам так і засталася няскончанай.

### БЭЗАВЫ КОЛЕР АЛЕЙНАЙ ФАРБЫ

Першы набор з цюбікамі алейнай фарбы я набыў у краме «Школьнік», што была на вуліцы Маркса. У каробцы ляжала дванаццаць тонкіх, крыху таўсцейшых за звычайны аловак свінцовых цюбікаў. Асабліва захапленне ў мяне выклікала бэзавая фарба. Я разоў сто адкручваў накрыўку і зазіраў у цюбік, каб палюбавацца алейнай бэзавасцю, каб атрымаць асалоду ад смачнага водару фарбы. Гэтым наборам я расфарбаваў ліяны, што напаўнялі трапічны лес Флорыды. Тады я захапляўся гераічнымі індзейцамі. Маляваў іх у непралазным лесе, сярод рознакаляровых ліян. З таго першага набору запомнілася чамусьці толькі бэзавая фарба.

### ПЕРШАСНЕГ

Мастак заўжды чакае першаснегу. Ад яго змрочнае гарадское навакольле робіцца больш светлым, у майстэрні становіцца менш цемры, а з'яўляецца больш прасторы і радасці. Зазвычай першы снег доўга не ляжыць: і паўдня не мінае, як ён растае. Сёлета снег затрымаўся. Лёгкі марозік не дае яму растаць ужо трэці дзень. У парку першаснег перамяшаўся з залатой лістотай каштанаў. Дзівоснае злучэнне залатога і белага нагадала пра маё далёкае мастакоўскае дзяцінства...

У майстэрню да жывапісца Каткова я прыйшоў у тую марозную нядзелю самы першы. Сяргей Каткоў даў мне грошы і папрасіў схадзіць у хлебную краму па абаранкі і батон-пляцёнку. Ён збіраўся паставіць для вучняў новы нацюрморт. У краме моцна пахла свежым хлебам, абаранкі мне дасталіся яшчэ цёплымі. Я вяртаўся ў Палац школьнікаў па засыпанай снегам дарозе з апетытнымі абаранкамі ў руках. Мне было важна, што стары настаўнік мне, малому школьніку, даверыў грошы і даў дарослае даручэнне. Белы кубак з белым фарфоравым чайнікам, абаранкі і батон-пляцёнку на сіняй драпіроўцы я тады напісаў акварэллю незапамінальна.

### УЛАСАЎ І СВЕЖАСЦЬ

Калі я пасля доўгага перапынку вярнуўся ў мастацкую студыю, дзе раней выкладаў Сяргей Каткоў, на яго месцы працаваў Ігар Уласаў. У дзень майго вяртання Уласаў паставіў вялікі нацюрморт з паўпразрыстай блакітна-зеленкаватай драпіроўкаю і невялікім гіпсавым канём. У пастаноўцы была ранішняя свежасць марскога берага. Нацюрморт я пісаў на вільготнай паперы. Тады была мода — маляваць акварэллю па вільготным. Пастаноўка напісалася за адзін сеанс. Можа, я б той нацюрморт і працягваў пісаць, і засушыў бы яго, і зачарніў, каб не ўхваленне Уласава і не ягоная прапанова пачаць працу над іншай пастаноўкай.



### МАМА І СЯРГЕЙ ПЯТРОВІЧ

Зайшоў да мамы. Занёс ёй крыху прадуктаў: хлеб, тварог, смятану, рыс і грэчку. Папілі гарбаты. Я сказаў, што днямі Сяргею Пятровічу Каткову споўнілася сто гадоў. Маці крыху здзівілася. Такія лічбы, як сто чалавечых гадоў, заўжды здзіўляюць. Здаецца, што ўчора... А тут — сто гадоў. «Ты памятаеш, як Сяргей Пятровіч да нас прыходзіў?» Я прызнаўся, што не помню. «Была нядзеля. Мы позна ўсталі. Сядзелі за сталом і снедалі, калі нехта пазваніў у дзверы. Я пайшла адчыняць. У дзвярах стаяў невысокі дзядок. Ён спытаў, ці тут жыве Валодзя Адамчык. Ты пазнаў яго па голасе і прыбег з кухні... «Мама, гэта ж Сяргей Пятровіч, са студыі!» Мы запрасілі Сяргея Пятровіча за стол. Ён паскардзіўся, што ты не ходзіш у студыю і кінуў маляванне, а гэта кепска, бо ты мастак ад прыроды. У цябе своеасаблівае бачанне і шмат ідэй. Табе трэба маляваць. І я, і тата паспрабавалі пераканаць Сяргея Пятровіча ў іншым, што ты лепшы матэматык у класе і табе варта займацца матэматыкай, а не маляваннем. Калі нам здалося, што мы пераканалі Сяргея Пятровіча, ён спытаў, ці прыходзілі да нас дамоў матэматыкі. Не. А мастак прыйшоў... Ты вярнуўся ў студыю».

### ЧАЛАВЕК З ЛЕСВІЦАЙ

У студыю маляваць я хадзіў самастойна. Калі ж Сяргей Пятровіч Каткоў запрасіў нас на адкрыццё выставы ў дзяржаўны музей, я прыйшоў туды з мамаю. Пераступіўшы праз сорам (не ведаю, чаму і чаго я саромеўся), я павітаўся з Катковым. Ён пахваліў мяне, а мама сказала некалькі добрых слоў пра яго нацюрморт з грыбамі. На той выставе мяне ўразіла палатно Вашчанкі «Чалавек з лесвіцай». Чалавек крочыў, несучы на плячы лесвіцу, побач бег сабака, поруч ляцелі два галубы. Чалавек крочыў у залацістай і казачнай прасторы, паміж небам і зямлёю. Гэта быў зусім малады, зусім новы чалавек. Ніколі пазней ніводнае палатно Гаўрылы Вашчанкі мяне так не ўражвала. Але я ніколі і не шкадаваў, што вучыўся менавіта ў яго, менавіта на кафедры манументальнага мастацтва, якой ён узначальваў. Яшчэ на той жа выставе мяне спыніў нацюрморт Альгерда Малішэўскага «Рускія падносы». У Малішэўскага я таксама вучыўся з радасцю.

Я згадаў тую даўнюю выставу, калі сёлета ў краме «Зрабі сам» набыў лесвіцу. З алюмініевай лесвіцаю я крочыў па ранішнім Мінску і згадваў сваіх настаўнікаў: Каткова, Малішэўскага, Вашчанку... Згадваў з прыемнасцю.

### БАТУТНЫЯ ГІМНАСТЫ

Трэба было напісаць «батутныя акрабаты», але мы — я і Міша Пракоф'еў — лічылі сябе батутнымі гімнастамі. Мы разам хадзілі ў студыю выяўленчага мастацтва, якой кіраваў Сяргей Каткоў. Студыя тая была ў Палацы піянераў і школьнікаў, на трэцім паверсе. У ёй, вядома ж, меліся і рукамыйнік з прыбіральняю. Гэтыя выгоды былі агульнымі з гімнастычнай залаю. А ў той зале стаяў вялікі белы батут! Часам у нядзелю мы прасілі Сяргея Каткова пакінуць нас у студыі, маўляў, не паспелі падамаляваць карціны. Каткоў пакідаў ключ і сыходзіў, а мы ляцелі ў гімнастычную залу, каб скакаць на батуце. Мы скакалі на ім у чаравіках. Недаравальны ўчынак! Я скакаў і крычаў на ўсю залу: «Я — батутны гімнаст!» Міша Пракоф'еў таксама скакаў і крычаў. А яшчэ і рэха за намі крычала: «Я — батутны гімнаст!» Пазней я даведаўся, што скачкі на батуце — самы небяспечны від спорту, бо ў ім найбольшая колькасць смяротных выпадкаў, спартсмены часцяком ломяць сабе шыі на такім прыгожым белым батуце. Нам пашанцавала, нас — Мішу Пракоф'ева і мяне — ні разу не злавілі і не пакаралі за тое, што мы скакалі на батуце ў чаравіках.

### ГАРАДЫ

На кавалку шчыльнай паперы намаляваўся казачны горад з рознакаляровымі дамкамі пад чырвонай дахоўкаю. «Гэта ж не Мінск! — здзівіўся мой настаўнік малявання. — Гэта ж Вільня!» Я і сам выдатна бачыў, што намаляваў не наш Мінск, а фантастычны горад з высокімі комінамі і вострымі флюгерамі. «Ты ў Вільні калі-небудзь быў?» — спытаў Сяргей Каткоў. Я ніколі не ездзіў у Вільню. «Ты яшчэ патрапіш у яе. Прыйдзе час — і ты паглядзіш на казачную сталіцу...»

Цяпер, праз трыццаць восем гадоў пасля той размовы з Катковым, я стаю на маленькім балкончыку сваёй віленскай кватэры і гляджу на старажытную сталіцу. Каляровыя дамкі пад цёмнай дахоўкаю, цагляныя коміны, ружовыя вежы, крыжы і флюгеры... Па маёй вуліцы Піліма шыбуюць прахожыя, коцяцца машыны, сунуцца тралейбусы... А я чакаю чорнага каня. На тым даўнім малюнку быў яшчэ конь, чорны конь, запрэжаны ў залатую каралеўскую карэту.

Адам ГЛОБУС.

■ Неасабісты суб'ектыў

# НА ЎЗРОЎНІ НАДСВЯДОМАСЦІ

## Чым родная мова адрозніваецца ад той, на якой гаворым



НЕ ведаю, як вы, а я асабіста ўжо некалькі апошніх дзён не-не дый задумаюся: як бы гэта сёлета Дзень роднай мовы адзначыць? (Калі хто не памятае, ён у нас, як і ва ўсім свеце, паслязаўтра, у нядзелю.) Часу засталося няшмат, а нічога слушнага ў галаву не прыходзіць. А свята ж гэта, нягледзячы на яго ў апошні час публічнасць, самае, бадай, з усіх, што ёсць, асабістае. Бо родная мова — не з'ява, не паняцце, не словазлучэнне. Я б назвала яе надсвядомым светаўспрыманнем. Якое не з'яўляецца пад прымусам ці ад спакусы, якое не знікае па загадзе ці паводле чыйгосьці прыкладу. Якое ёсць у кожнага без выключэння, як душа, або, скажам, сумленне. Якое ў кожнага сваё, і хоць «сэрца аб зоры разбі», ты яго ніяк не перайначыш.

ВОСЬ, напрыклад, крылаты сімвал краіны. Як гэтую птушку назваць? «Аист»? «Бусел»? У нашай двухмоўнай краіне зразумеюць і той, і той варыянты. Я нават трэці ведаю — «cigogne» (гэта па-французску, даводзілася іншаземцам пра сваю краіну расказваць, а як жа без яго абыдзешся?). Але па-сапраўднаму, у тым самым надсвядомым светаўспрыманні, для мяне гэта бусел, і ніяк інакш. Значна больш, чым птушка. Гэта росны поплаў, высокае сіняе неба, копы маладога сена, босыя ногі, якія казыча скошаная трава. І звонкае-радаснае, што ў бездань неба, задраўшы галаў, крычыш: «Бусел-бусел, вылі воду, закружыся на пагоду!», і адчуванне абсалютнага шчасця, калі пасля тваёй замовы белая птушка пачне павольна кружыць ля самага сонца...

Або, скажам, шыдэлак. Цэлая праблема з ім нядаўна атрымалася. Шукала яго ў руска-беларускім слоўніку, а там яго няма! «Крючок» — і ўсё тут! А што агульнага можа мець кручок, на які зачшэплівалі штовечар дзверы роднай хаты ў сенцах, з карункавымі падзорнікамі пад высокімі ложкамі, з крухмальнымі сурвэткамі, якія ўсе бабуля шыдэлкам старанна вязала?!..

Мая сваячка, якая пайшла вучыцца ў сталіцу яшчэ ў пачатку васьмідзесятых, нашу вясковую мову разам са сваёй вясковасцю заўзята з сябе выціскала. І выціснула-такі: праз дваццаць гадоў настолькі чыста гаварыла па-руску, што нават нашага заўсёднага «дзекання» і «цекання» ў яе чуваць не было. Але калі гадоў дзесяць назад раптоўна прама на рабоце спынілася сэрца ў яе маладога мужа, мне ў трубку яна роспачна і проста сказала: «Наш бацька памёр», і ўжо мы абедзве ведалі і разумелі, якая гэта страшная і непапраўная бяда стаіць за гэтымі знаёмымі з дзяцінства словамі — сям'я страціла апору і кармільца, бо там, дзе мы нарадзіліся, бацькам і маці звалі адно аднаго сужэнцы, якія жывуць у ладзе і даверы... А нядаўна я пачула, як яна спявае сваёй маленькай унучцы калыханку пра ката, які «пайшоў на гулі, памарозіў лапкі, залез на палаткі. Сталі лапкі грэцца — няма коціку дзе дзецца...» Бо менавіта так у нас спрадвеку спявалі самым маленькім, самым любімым, люляючы іх на руках...

ДА чаго, уласна кажучы, вяду. Родная мова, атрымліваецца, — мова асацыяцый. Назвы і паняцці, якія закладзеныя ў розум і душу з маленства, нават калі чалавек яшчэ не ўмее гаварыць. І тое, што беларускую мову падчас апошняга перапісу насельніцтва назвалі роднай больш за шэсцьдзясят працэнтаў апытаных, пры тым, што гавораць на ёй у паўсядзённым жыцці толькі трыццаць, — ніякі не парадокс, абсалютна рэальная з'ява. Праблема ў іншым. Калі родную (у нашым выпадку — канешне ж, беларускую) мову не выпусціць з межаў надсвядомага светаўспрымання ў паўсядзённы ўжытак (а менавіта гэта нават тыя, хто абсалютна шчыра называе яе роднай, рабіць не спяшаюцца), у нашых дзяцей не будзе таго самага асацыятыўнага ланцужка, які родную мову для кожнага асобна такой і робіць. А не будзе яго — з самага дзяцінства, яшчэ калі чалавечак і гаварыць не ўмее — для новага пакалення роднай мовай будзе іншая. І ўжо няважна будзе, колькі гадзін беларускай адвядуць у школе, якія дырэктыўныя меры па яе падтрымцы прымуцца, з якіх трыбун і на якіх мерапрыемствах яна будзе гучаць, як і належыць дзяржаўнай мове, наколькі модна сярод моладзі будзе на ёй размаўляць... Якой з гэтага бяды, спытаеце? У прынцыпе ніякай. Толькі вось... Родная мова і Радзіма — паняцці сугучныя, словы роднасныя. Калі мець на ўвазе гэта, задумацца кожнаму з нас аб уласнай ролі ў гісторыі і лёсе краіны Беларусь (не больш, не менш — менавіта так!) сапраўды варта...

ЯПАКУЛЬ не прыдумала, як сёлета адзначыць Дзень роднай мовы. Але дакладна ведаю: у гэту нядзелю, як і ва ўсе іншыя дні, першае, што пачую, прачнуўшыся, маміна «Добрай ранічкі!». І скажу ў адказ: «Добрай! Як табе спалася?..» Па сённяшнім часе зусім нямала.

Алена ЛЯЎКОВІЧ. alena@zviazda.by

■ Гарызонты

# СПЕЦЫЯЛІСТЫ... ПА РАСШЫФРОЎЦЫ ДНК

**У Беларускім дзяржаўным універсітэце будуць рыхтаваць спецыялістаў па біяінфарматыцы. На факультэце радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ ў рамках спецыяльнасці «Прыкладная інфарматыка» адкрываецца спецыялізацыя «Біяінфарматыка». Набор на яе будзе ажыццяўляцца з ліку студэнтаў-трэцякурснікаў, якія навучаюцца па спецыяльнасці «Прыкладная інфарматыка».**

У Беларусі падрыхтоўка спецыялістаў у галіне біяінфармацыйных тэхналогій да гэтага часу не ажыццяўлялася. Неабходнасць адкрыцця новай спецыялізацыі абумоўлена развіццём навуковых даследаванняў у нашай краіне ў галіне расшыфроўкі ДНК для дыягностыкі і лячэння розных захворванняў. Таму з'явілася патрэба ў кваліфікаваных спецыялістах-даследчыках, якія валодаюць камп'ютарнымі тэхналогіямі, метадамі біяінфарматыкі і інтэлектуальнага аналізу генетычных дадзеных, а таксама ўмеюць распрацоўваць і ўкараняць новыя біяінфармацыйныя тэхналогіі для сучаснай біямедыцынскай тэхнікі.

Біяінфарматыка, як новы навуковы кірунак, носіць міждысцыплінарны характар. Таму вучэбная праграма ўключае інтэлектуальны аналіз звестак, біяінфарматыку, аналіз біямедыцынскіх малюнкаў, праграмаванне баз звестак і сістэм апрацоўкі інфармацыі, мадэляванне біяфізічных сістэм і іншыя дысцыпліны.

Надзея НІКАЛАЕВА. nikalaeva@zviazda.by

**РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки»**
**извещает о проведении 21 марта 2016 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже объекта недвижимости – здания цеха безалкогольных напитков, расположенного по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4А, принадлежащего ДОБРУШСКОМУ РАЙОННОМУ ПОТРЕБИТЕЛЬСКОМУ ОБЩЕСТВУ на праве собственности**

| № лота | Наименование объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена, бел. руб. (в т.ч. НДС 20%) | Задаток, бел. руб. (в т.ч. НДС 20%) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Здание цеха безалкогольных напитков, инв. №311/С-38755** | Назначение: здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака. Одноэтажное кирпичное оштукатуренное здание 1986 года постройки. Общая площадь 182,4 м.кв. Составные части и принадлежности: две кирпичные оштукатуренные пристройки, блочная оштукатуренная пристройка, кирпичная пристройка, сарай, погреб, насосная станция. | **308 400 000** | **15 500 000** |
| | *__Земельный участок__ для обслуживания здания на праве постоянного пользования площадью __0,3800 га__ с кадастровым номером 321250100003001550. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством* | | | |
| Шаг аукциона – 5% | | | | |

Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23.

Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 18 марта 2016 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявленному лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **21 марта 2016 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект.

